

АДМЕТНЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ ЯНКІ КУПАЛЫ 9

ПАДАРОЖЖА Ў ІЕРУСАЛІМ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2020 г. СУБОТА № 188 (29302)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар СТОМА, рэктар Гомельскага дзяржаўнага медуніверсітэта:**

*«Тое, што мы бачым сёння ў ахове здароўя — гэта прынцыпова іншы свет. Яго часам называюць постковіднай эрай. І толькі той, хто адаптуецца хутка да гэтай эры, у тым ліку сістэма вышэйшай адукацыі, будзе наперадзе. У сувязі з гэтым вельмі важныя пытанні лічбавізацыі навучання, максімальнай інтэграцыі студэнтаў, прафесіяналаў-выкладчыкаў у клінічныя сістэмы».*

# Сад бэзавай квецені



Фота БелТА.

У Каложскім парку Гродна некалькі гадоў назад была закладзена алея па праекце «Бэз Перамогі», прымеркаваная да 75-годдзя Вялікай Перамогі. А ўчора праект атрымаў працяг — быў дадзены старт новай акцыі, больш глабальнай і доўгатэрміновай, прысвечанай ужо 100-годдзю Перамогі. Да 2045 года ў парку каля старажытнага храма будзе высаджаны сапраўдны бэзавы сад, у якім будзе красаваць больш за 250 кустоў.

## КОРАТКА

• **На другім энергаблоку БелАЭС пачаліся выпрабаванні сістэм бяспекі рэактара.**

• Кітайска-беларускі інавацыйны цэнтр прамысловых тэхналогій з'явіўся ў «Вялікім камені».




• **МТЗ пакажа на «Белагра» самы магутны трактар у новым дызайне.**

• Беларуская чыгунка за студзень—жнівень павялічыла грузаперавозкі ў Кітай у 1,2 раза.

• **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Талін да 14 кастрычніка.**

• Натарыусы Брэсцкай вобласці правядуць бясплатныя кансультацыі 1 кастрычніка.

• **За тыдзень у Беларусі ўстаноўлена шэсць фактаў незаконнай здабычы лася.**

Праекты і рашэнні

## Старажытныя артэфакты для нашчадкаў

### У Гродне з'явіцца першы ў краіне Цэнтр рэстаўрацыі і даследаванняў

**Ён размесціцца ў адным з гістарычных будынкаў горада па вуліцы Акадэмічнай. Калісьці двухпавярховы асабняк належаў вядомаму гродзенскаму лекару, але за больш чым 100-гадовую гісторыю прыйшоў у аварыйны стан. Хутка тут пачнуцца рамонтныя работы — працаваць ёсць над чым.**

Трэба сказаць, што спецыялісты — рэстаўратары Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея — ужо асвойваюць сваю будучую майстэрню. Праўда, умовы для працы не вельмі спрыяльныя, затое тут вельмі прасторна. Для кожнага — асобнае памяшканне. Можна зручна размясціць і прылады для працы, і самі прадметы. А яны надзвычай цікавыя.

СТАР. 7

Размова па сутнасці

## «У бацькоў могуць быць розныя погляды,

### але спачатку трэба даць дзіцяці вырасці здаровым і атрымаць адукацыю»



Фота БелТА.

**На бягучым тыдні тэма ўдзелу дзяцей у несанкцыянаваных мітынгах гучала з вуснаў прадстаўнікоў Генеральнай пракуратуры і кіраўніцтва ўрада. Некаторыя падлеткі выходзяць на плошчы самастойна, а іншых малых бацькі прыводзяць туды за руку. Нягледзячы на тое, што палітыка — гэта часта вялікая гульня, дзецям у ёй не месца. Пакаранне будзе не жартоўнае, а рэальнае — 26 бацькоў, якія былі на несанкцыянаваных мітынгах з дзецьмі, ужо прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. А ўсяго на разглядзе каля 280 спраў па парушэнні дзецьмі правілаў паводзін і ўдзелу ў несанкцыянаваных мітынгах. Такія лічбы агучыў у чацвер на чарговым пасяджэнні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, створанай пры Савеце Міністраў, яе кіраўнік, віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА. Карэспандэнту «Звязды» ўдалося больш дэталёва абмеркаваць з намеснікам прэм'ер-міністра гэтую праблему.**

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Сёння кіламетры — гэта не адлегласць»

**Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пачнецца ў панядзелак, ужо на бягучым тыдні задаў лейтматыў для многіх сустрэч у Палацы Незалежнасці. У аўторак пра кірункі супрацоўніцтва Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка размаўляў з губернатарам Прымор'я Алегам Кажамякам, а ў пятніцу тэму падхапілі яго калегі з Ленінградскай і Іркуцкай абласцей.**

## Будаваць парты сяброўства

Падчас сустрэчы з губернатарам Ленінградскай вобласці Аляксандрам Драздзенкам Прэзідэнт Беларусі прапанаваў пабудаваць сумесны тэрмінал у порце на Балтыцы.

«Вельмі шмат мы зараз кажам аб змяненні лагістыкі пастаўкі нашых тавараў. Порт Усць-Луга — гэта ж Ленінградская вобласць. Нам трэба дамовіцца, чаго б гэта ні каштавала, а пытанне адно — гэта чыгуначныя тарыфы і перавалка ў партах. Калі я сустракаўся з Прэзідэнтам Расіі, мы вельмі шмат абмяркоўвалі гэта пытанне, і я яму сказаў, што мы можам з ленінградцамі скааперавацца і пабудаваць там свой прычал, порт», — паведаміў Прэзідэнт Беларусі.

Па яго словах, фінансы на гэту інфраструктуру можна ўзяць са сродкаў, сэканомленых на атамнай станцыі, што будуецца за расійскія крэдыты: «Мы гатовы ўзяць крэдыт з сэканомленага і ўкласці ў будаўніцтва тэрмінала там».

Прэзідэнт нагадаў прадстаўнікам паўночнага рэгіёна Расіі пра нашы магчымасці ў сельгасмашынабудаванні, ліфтавай вытворчасці. Гатовы дапамагчы беларусы і ў развіцці сельскай гаспадаркі.

«БНБК, наша новая біятэхналагічная кампанія, пачала вытворчасць суперсучасных кармоў. Ведаю, што ў вас рыбная гаспадарка вельмі развітая. Яны мяне прасілі, каб я вам перадаў, калі вас задаволіць (а я ўпэўнены, што вы аддасце перавагу гэтай кампаніі, таму што якасць, узровень, людзі нармальныя працуюць) і для рыбнай гаспадаркі неабходныя будуць гэтыя кармы, мы з задавальненнем будзем з вамі супрацоўнічаць», — падкрэсліў беларускі Прэзідэнт і прапанаваў разгледзець магчымасць сумеснага рыбнага прадпрыемства.

Прытым ён падкрэсліў, што беларусы прапануюць толькі тое, у чым Ленінградская вобласць мае патрэбу. «Мы гатовы шмат зрабіць для вашай вобласці, бо мы ў пэўнай ступені і канкурэнты. Ленінградская вобласць забяспечвае сельгаспрадукцыяй і іншым Піцер. Магчыма, не ў поўным аб'ёме. Мы гатовы аб'ём дапоўніць, каб поўнасцю закрыць патрэбы Піцера», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Драздзенка павіншаваў Прэзідэнта Беларусі з абраннем на пасаду і адзначыў, што перагаворы двух лідараў «даюць нашым рэгіёнам надзею, што мы працягнем курс на супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове».

Як расказаў Аляксандр Драздзенка пазней журналістам, абмяркоўвалі на сустрэчы не толькі традыцыйныя, але і новыя кірункі супрацоўніцтва. Плануюць расіяне купляць у Беларусі вялікія і малыя ўстаноўкі па ачыстцы вады. Яшчэ адна цікавая тэма — пастаўка беларускіх камбінаваных аўтобусаў. Пракаментаваў губернатар і магчымасці пастаўкі беларускіх грузаў цераз парты Фінскага заліва. «Мы сёння казалі пра тое, што неабходна выбудаваць сучасную лагістыку. Зразумела, што неабходны прыцягальныя чыгуначныя тарыфы, прыцягальныя сцівідорныя паслугі, каб было выгадна беларускія грузы перагружаць цераз нашы партовыя комплексы», — дадаў ён.

Наконт сумеснага тэрмінала Аляксандр Драздзенка адзначыў, што неабходна вырашыць, якія тавары там плануецца перагружаць. Але больш прывабная іншая прапанова — увайсці капіталам у праекты, якія ўжо будуюцца.

## Доступ у любы пункт Беларусі

Найперш падчас сустрэчы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў губернатара Іркуцкай вобласці Ігара Кобызева з перамогай на мясцовых выбарах з вялікай перавагай галасоў. Ён таксама выказаў меркаванне, што губернатары ўнеслі шмат у развіццё адносін паміж дзяржавамі.

Прэзідэнт адзначыў, што здабыткам Саюзнай дзяржавы сёння стала шырокая сетка міжведамасных кантактаў і сумесных органаў. «Мы вельмі многія пытанні сёння можам вырашаць, але не вырашаем. Нам трэба, каб нас хтосьці падагнаў. І гэта ў пэўнай ступені бяда, якая абрынулася на Беларусь у сувязі з «каляровымі» рэвалюцыямі, прымусіла нас сур'ёзна паглядзець на нашы адносіны. Мы зразумелі, што нам няпроста ў гэтай сітуацыі, Беларусі і Расіі, мы ўбачылі, што можам абысціся без іх. Чаму мы заўсёды пакутуем ад гэтых санкцый?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што ў дзвюх краін самадастатковая эканоміка — добра развітыя і прамысловасць, і сельская гаспадарка, і навука. «Нам трэба сабрацца, намецiць агульныя планы і дзейнічаць у гэтым кірунку, забяспечваючы ўсім неабходным нашых людзей. Таму ваш прыезд для нас вельмі важны», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт назваў Іркуцкую вобласць «гігантам, апорнай вобласцю ў Сібіры» і сказаў, што многія практычныя пытанні ўжо вырашаліся, ім неабходна толькі надаць другое дыханне.

«Дзесьці нам проста неабходна страсянуцца, як ва Усоллі ў нас прадпрыемства з «Магілёўліфтмашам». Там нейкія дробныя пытанні, я думаю, мы іх зможам вырашыць. Мабыць, на постсавецкай прасторы, гэта адзінае прадпрыемства, з якім вы можаце працаваць па замене ў такой колькасці і аб'ёме ліфтаў, — сказаў Прэзідэнт. — І не толькі ліфты, а і горнашахтавае абсталяванне, грузавыя аўтамабілі. Я ведаю, што вы малайцы, грамадскі транспарт вы падтрымліваеце. Калі ласка — з аўтаномным ходам электробусы, падзарадзіўся і паехаў». Аляксандр Лукашэнка працягнуў тэму: беларусы аддаюць шмат увагі электрычнаму транспарту, транспарту на газаматорным паліве. «Мы забяспечым доступ у любы пункт Беларусі, каб вы маглі паглядзець яшчэ раз і ўпэўніцца, што мы штосьці можам зрабіць для нашых сібіракоў, якія заўсёды карысталіся павагай у беларускага народа. Вы недалёка ад нас. Сёння кіламетры — гэта не адлегласць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У размове з журналістамі Ігар Кобзеў расказаў, што рэгіён зацікаўлены ў маштабным лесааднаўленні, таму плануе наведацца на беларускія лесагадавальнікі. У парадку дня візіту — знаёмства з прамысловымі кластарамі па камунальнай тэхніцы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

Сацыяльны вектар

# 65 РУБЛЁЎ НА КОЖНАГА

### Аб падатковых і іншых ільготах для сем'яў з дзецьмі расказваюць спецыялісты

**Для шматдзетных сем'яў у краіне прадугледжаны розныя віды падтрымкі. Адна з іх — падатковыя льготы. Яны датычацца і стандартных падатковых вылікаў па падаходным падатку з фізічных асоб — той сумы, якая не абкладаецца такім падаткам у складзе зарплаты. Аб гэтым расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**

— Стандартны падатковы вылік для сем'яў з адным дзіцем робіцца ў памеры 34 рублі, з двума і больш — 65 рублёў на кожнага. Напрыклад, супрацоўнік атрымлівае тысячу беларускіх рублёў. З улікам таго, што ў яго ёсць дзеці, падаткам абкладаецца не ўся сума заробатнай платы, а заработная плата за вылікам гэтай ільготы — а гэта практычна 200 рублёў. Стандартны падатковы вылік штогод індэксуецца. Таксама шматдзетным сем'ям даюцца самыя вялікія льготы па зямельным падатку і падатку на нерухомасць. Усё тое, што ім належыць (будынкі, збудаванні, кватэры, гаражы, зямельныя ўчасткі), цалкам вызваляецца ад такой выплаты. Выключэнне складаюць толькі тыя выпадкі, калі гэтыя капітальныя будынкі або зямельныя ўчасткі прызначаны ці выкарыстоўваюцца для прадпрымальніцкай дзейнасці.

Да канца года запланавана накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў 15 тысяч шматдзетных сем'яў. На сёння гэта заданне выканана на 75 працэнтаў, расказала **начальнік аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Іна ПІНКОЎСКАЯ.**

— Іх дзяржаўная падтрымка ажыццяўляецца ў пазачарговым парадку, акрамя таго, такія сем'і накіроўваюць на будаўніцтва жылля на працягу года з даты прыняцця на ўлік тых, хто мае патрэбу. У сельскіх населеных пунктах, малых гарадах пытанне забеспячэння шматдзетных сем'яў жыллём на працягу года фактычна вырашана. Думаю, у вялікіх гарадах мы таксама ў найбліжэйшы час выйдзем на гадавы тэрмін. Шматдзетная сям'я можа атрымаць або льготны крэдыт па указе Прэзідэнта № 13, або субсідыі па Указе Прэзідэнта № 240. Калі гаварыць аб будаўніцтве жылля па першым указе, льготны крэдыт такой сям'і будзе прапанаваны на 40 гадоў пад адзін працэнт гадавых. Памер крэдыту вылічваецца зыходзячы з 20 квадратных метраў на чалавека і з нарматыву кошту квадратнага метра ў 817 рублёў. Калі шматдзетная сям'я, напрыклад, будуе аднакватэрны дом у сельскай мясцовасці, то памер дзяржаўнай падтрымкі там значна большы. Калі ў сям'і выхоўваецца чатыры непаўналетнія дзіцяці, па крэдыце на жыллё бацькі не будуць аплачваць ні працэнты, ні суму асноўнага доўгу, за іх гэта будзе пагашаць дзяржава.

Таксама на сёння важнай з'яўляецца магчымасць датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў, адзначыла Іна Пінкоўская. У выпадку, калі кошт жылога памяшкання меншы, чым памер дзяржпадтрымкі, сям'я можа гэтую суму пагасіць за кошт сямейнага капіталу.

**Кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Святлана БЕЛАШ** расказала, што ў краіне зараз пражывае каля 110 тысяч шматдзетных сем'яў, дзе выхоўваецца больш за 360 тысяч дзяцей. На такія сем'і прадугледжана 11 відаў выплат.

— Сёння іх атрымліваюць бацькі кожнага чацвёртага дзіцяці. Калі ў сям'і з'яўляецца двойня або тройня, для іх ёсць дадатковая дзяржпадтрымка. Гэта і аднаразовая выплата пры нараджэнні на набыццё дзіцячых і іншых рэчаў першай неабходнасці, — па 513 рублёў на кожнае дзіця. У першым паўгоддзі бягучага года такія выплаты атрымалі 406 сямей. Таксама дапамога можа быць не толькі фінансавай. Напрыклад, актуальная паслуга няні на бязвыплатнай аснове: да 20 гадзін у тыдзень па доглядзе за двойняй і да 40 гадзін — за тройняй. Сёлета такой паслугай скарысталіся 1600 сем'яў, якія выхоўваюць двайнят і 33 сям'і з трайнятамі. У сістэме адраснай сацыяльнай дапамогі для сем'яў з двайнятамі і трайнятамі прадугледжана бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання для дзяцей да двух гадоў без уліку даходаў сям'і. У сярэднім такі набор абыходзіцца ў 110 рублёў у месяц. Яшчэ ёсць магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал на платныя медыцынскія паслугі, адукацыю і іншае. Дарэчы, шматдзетнымі сем'ямі за перыяд з 2015 года адкрыта больш за 78 тысяч дэпазітных рахункаў, з іх 10 тысяч — сёлета.

У маі ў сілу ўступіў Указ Прэзідэнта № 171, па якім прадугледжаны дадатковыя пенсійныя гарантыі для шматдзетных сем'яў, яны ўступяць у сілу з 1 студзеня 2021 года. Для такіх сем'яў з 1 верасня 2021 года прадугледжана павелічэнне перыяду атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі з 6 да 12 месяцаў.

У сістэме адукацыі таксама ёсць шэраг ільгот для дзяцей, якія выхоўваюцца ў шматдзетных сем'ях, расказала **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Беларусі Алена СІМАКОВА:** «Ва ўстановах дашкольнай адукацыі бацькам, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, на 50 працэнтаў зніжаецца кошт харчавання. Ва ўстановах агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі (дзе рэалізуецца праграма агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі) для гэтых дзяцей прадугледжана бясплатнае харчаванне. Таксама такім навучэнцам даецца зніжка ў 50 працэнтаў на вучэбныя дапаможнікі».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

---

Парламенцкі дзённік

# «Заява Сейма Літвы супярэчыць здароваму сэнсу»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ такім чынам выказаўся наконт прынятай 22 верасня рэзалюцыі Сейма Літвы «Аб пагрозе ядзернай бяспекі Еўропе ў сувязі з падзеямі ў Беларусі». Яна змяшчае заклік да нашых улад неадкладна спыніць падрыхтоўку да эксплуатацыі БелАЭС.**

«Заява Сейма Літвы ад 22 верасня супярэчыць здароваму сэнсу. Коснае непрыманне аб'ектыўнай рэальнасці становіцца сур'ёзным бар'ерам для развіцця літоўскай палітычнай культуры, — перадае словы дэпутата прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. — Мы выразна бачым, як яно дэвальвіруе важкасць меркаванняў літоўскага парламента з-за пагарды да асноў цывілізаваных міждзяржаўных адносін».

Андрэй Савіных сцвярджае, што Беларуская АЭС будзе самай надзейнай і бяспечнай станцыяй у свеце і прыводзіць падставы, якія дазваляюць так казаць, — праект будаўніцтва быў рэалізаваны ў адпаведнасці са стандартамі Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі, былі праведзены стрэс-тэсты пад наглядам Еўрасаюза, якія распрацаваны для яго членаў. Усе эксперты, якія ўдзельнічалі ў шматлікіх праверках станцыі, неаднаразова пацвярджалі яе бяспеку.

«Энергаблокі Беларускай АЭС адносяцца да найноўшага пакалення 3+, дзе выкарыстаны самыя перадавыя дасягненні і распрацоўкі. Яны цалкам адпавядаюць узмоцненым міжнародным нормам і рэкамендацыям па бяспецы МАГАТЭ. Нароўні з сістэмамі бяспекі, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца, тут ужываецца цэлы комплекс дадатковых сістэм», — кажа парламентарый.

Па яго словах, запуск Беларускай АЭС таксама дасць магчымасць знізіць выкіды парніковых газаў больш чым на 7 мільёнаў тон у год.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «У бацькоў могуць быць розныя погляды...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Ігар Віктаравіч, пытанне, якое цікавіць многіх: удзел дзіцяці разам з бацькамі ў мітынгу можа стаць падставай для прызнання знаходжання дзіцяці ў сацыяльна небяспечным становішчы ці ўвогуле да пазбаўлення бацькоўскіх правоў?***

— У першую чаргу хацеў бы адзначыць, што мы, дарослыя, і перш-наперш бацькі, абавязаны забяспечваць захаванне правоў нашых дзяцей і іх бяспеку.

У той жа час відавочна, што калі бацькі, якія ўдзельнічаюць у несанкцыянаваных акцыях, мітынгах, бяруць з сабой дзяцей, яны тым самым ставяць пад пагрозу іх жыццё і здароўе. І ў гэтых выпадках дзяржава абавязана рэагаваць.

Згодна з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, бацькі, як удзельнікі несанкцыянаваных акцый і мітынгаў, прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. А гэта ўжо з'яўляецца падставай, каб пачаць працэдуру па прызнанні знаходжання дзіцяці ў сацыяльна небяспечным становішчы. І пры наяўнасці сукупнасці ўстаноўленых заканадаўствам крытэрыяў можа быць прызнана, што дзіця апынулася ў такім становішчы.

А калі бацькі знаходзяцца ў нецвярозым стане і бяруць дзяцей з сабой на масавыя мерапрыемствы — гэта ўжо непасрэдная пагроза жыццю і здароўю дзяцей. У гэтых выпадках орган апекі і папячыцельства мае права прыняць рашэнне аб неадкладным адабранні дзіцяці ў бацькоў і ў сямідзённы тэрмін накіраваць у суд іскавую заяву аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў.

***— Якія меры прыцягнення да адказнасці могуць прымяняцца ў дачыненні да бацькоў, якія прыходзяць са сваімі непаўналетнімі дзецьмі на мітынг? Якія законныя падставы будуць для іх пакарання?***

— Як я ўжо адзначаў, бацькі, як і ўсе іншыя дарослыя грамадзяне, якія бяруць удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, могуць быць прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці.

Пры гэтым я хацеў бы звярнуць увагу ўсіх бацькоў яшчэ на адзін момант. У адпаведнасці з заканадаўствам, да адказнасці могуць быць прыцягнуты і непаўналетнія з 16 гадоў, а за наўмыснае прычыненне цяжкага пашкоджання і іншыя гвалтоўныя дзеянні, напрыклад, за наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці, за дробнае хуліганства — з 14 гадоў.

У выпадку калі дзеці не дасягнулі ўзросту адміністрацыйнай адказнасці, прыцягваюцца да адказнасці іх законныя прадстаўнікі.

У дачыненні да прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці непаўналетніх праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, у якой таксама мусяць удзельнічаць законныя прадстаўнікі непаўналетніх. А да бацькоў магчыма прымяненне штрафных санкцый.

***— Месенджары і тэлеграм-каналы становяцца асноўнай крыніцай навін для маладога пакалення. Наколькі наша моладзь, на ваш погляд, можа крытычна ставіцца да інфармацыі, адрозніваць маніпулятыўныя тэхналогіі ад рэальных падзей? І — вечнае пытанне: хто павінен культываваць крытычнае мысленне — сям'я? Грамадства? Школа?***

— Так, наша моладзь, як і ва ўсім свеце, для атрымання інфармацыі выкарыстоўвае сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі: інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, розныя месенджары, найбольш актыўна — тэлеграм-каналы. А вось задача фарміравання ў непаўналетніх крытычнага стаўлення да атрымліваемай такім шляхам інфармацыі агульная для ўсіх нас: і бацькоў, і грамадства, і дзяржавы.

Адзначу, што дзяржаўнымі органамі і сродкамі масавай інфармацыі робіцца ўсё, каб на тэлеканалах, у газетах, у сетцы Інтэрнэт даць аб'ектыўную інфармацыю аб падзеях у краіне і свеце. Адначасова ва ўстановах адукацыі праводзіцца сістэмная работа па фарміраванні ў дзяцей і падлеткаў удумлівага, крытычнага стаўлення да таго, што яны чытаюць у стужках навін, сацыяльных сетках, на сайтах. Так, у сярэдніх школах, прафесійных ліцэях, каледжах рэалізуецца інфармацыйна-адукацыйны праект «Школа актыўнага грамадзяніна». У яго рамках з навучэнцамі праходзяць пагаварыць палітыкі, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання.

У той жа час бацькі павінны ствараць максімум умоў для фарміравання ў дзяцей адказнага стаўлення да вучобы, а не абмяркоўваць з імі свае палітычныя погляды і тым больш браць іх з сабой на спантанныя палітычныя мерапрыемствы. У бацькоў могуць быць розныя погляды, але спачатку трэба даць дзіцяці вырасці здаровым і атрымаць добрую адукацыю. І ў гэтым сям'і ў поўнай меры дапамагае дзяржава. Менавіта бацькі разам са школай павінны дапамагаць дзіцяці наладжваць адносіны са сваімі аднагодкамі, вучыцца дыялогу ў асяроддзі роўных сабе, умець адстойваць свой пункт гледжання ў класе, групе, аўдыторыі.

***— Моладзь — актыўны ўдзельнік пратэстаў, але і ў мітынгах, арганізаваных у падтрымку ўлад, таксама нямала маладых людзей. Ці не атрымаецца ў будучым расколатае грамадства? Якія крокі ў тым ліку і на дзяржаўным узроўні неабходна рабіць, каб захаваць адзінства беларусаў, кожны з якіх мае права на ўласнае меркаванне?***

— Дзяржава не падзяляе моладзь на ўдзельнікаў пратэсных ці мірных мітынгаў. На жаль, многія месенджары і тэлеграм-каналы бяруць на сябе смеласць сцвярджаць пра раскол грамадства ў цэлым, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі.

Кіраўнікі дзяржаўных органаў, дэпутацкі корпус праводзяць шматлікія сустрэчы з навучэнскай і студэнцкай моладдзю, на якія запрашаюцца ўсе ахвотныя. Практычную магчымасць выказваць свае палітычныя погляды, уплываць на рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў маладое пакаленне мае праз удзел у маладзёжным парламенцкім руху. Пры мясцовых Саветах дэпутатаў у рэгіёнах функцыянуюць маладзёжныя парламенты, палаты і саветы, у склад якіх уваходзіць моладзь. З ліпеня бягучага года 70 маладых дэпутатаў увайшлі ў склад Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь.

Тэлеграм-канал «Маладзёжны цягнік» размяшчае аб`ектыўную інфармацыю аб грамадска-палітычным становішчы ў краіне ў фармаце, які запатрабаваны ў маладзёжным асяроддзі. Гэты тэлеграм-канал створаны нядаўна, але кожны дзень колькасць яго падпісчыкаў павялічваецца.

Сёння і сям'я, і сам малады чалавек павінны разумець, што калі ты прайшоў складаныя ўступныя выпрабаванні ў навучальную ўстанову, неабходна перш за ўсё асвойваць выбраную прафесію, развівацца і ўдасканальвацца ў пэўным кірунку прафесійнага станаўлення, каб стаць паспяховым чалавекам.

***— Ёсць меркаванне, што сённяшнія пратэсты — мітынгі айцішнікаў і маладых прадпрымальнікаў, якія ў сваёй штодзённай працы накіраваны на заходніх партнёраў. Таму яны ў сваім успрыняцці жыцця аддалены ад гаспадарнікаў. Ці згодны вы з такой думкай? Ці можа гэтая акалічнасць стаць падставай для перацягвання (што назіраецца зараз) крэатыўнай, актыўнай, адукаванай, але пратэстуючай беларускай моладзі на Захад і што рабіць, каб гэта папярэдзіць?***

— Я не думаю, што тыя, хто ўдзельнічае ў несанкцыянаваных акцыях і мітынгах арыентаваны толькі на Захад і аддалены ад гаспадарнікаў і прагматыкаў. Шмат з іх, на жаль, проста паддаюцца фальшывым заклікам.

Што датычыцца ад'езду моладзі — перакананы, што наша моладзь любіць сваю краіну і хоча жыць, працаваць і гадаваць дзяцей у роднай Беларусі.

Дзяржава прыкладае і надалей будзе прыкладаць максімальныя намаганні, каб забяспечыць годны ўзровень жыцця для нашай моладзі і ўсіх грамадзян краіны.

Сёння распрацоўваецца Стратэгія развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2030 года. Мы ставім перад сабой новыя арыенціры па прыцягненні моладзі да вырашэння дзяржаўных задач, па развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы, пашырэнні дзейнасці студэнцкіх атрадаў і валанцёрскага руху, падтрымцы адоранай і таленавітай моладзі і многія іншыя. А непасрэдная рэалізацыя гэтых задач будзе ажыццяўляцца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка», якая таксама распрацоўваецца зараз.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Беражыце сябе!

# Сацыяльнае дыстанцыраванне і маскі

## Што дапаможа абараніцца ад вірусных інфекцый і COVID-19

**Улічваючы, што сезон павышэння захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў нашай краіне пачынаецца штогод у верасні, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь нагадала аб правілах сацыяльнага дыстанцыравання, як адной з асноўных мер прафілактыкі заражэння віруснымі інфекцыямі, у тым ліку COVID-19.**

Сацыяльнае дыстанцыраванне — комплекс немедыкаментозных санітарна-эпідэміялагічных мерапрыемстваў, накіраваных на спыненне або запаволенне распаўсюджвання інфекцыйнага захворвання. Яго мэта — знізіць верагодныя кантакты паміж інфіцыраванымі і здаровымі людзьмі.

Сэнс сацыяльнага дыстанцыравання — арганізаваць сваё жыццё такім чынам, каб скараціць на 75 % кантакты па-за межамі дома і работы, і на 25 % — на рабоце. Калі людзі прытрымліваюцца гэтых рэкамендацый, пазбягаючы грамадскіх месцаў і ў прынцыпе абмяжоўваючы свае перамяшчэнні, распаўсюджванне інфекцыі запавольваецца, стрымліваецца яе выбуховы рост.

### Асноўныя прынцыпы сацыяльнага дыстанцыравання:

1. Мінімізаваць колькасць кантактаў з іншымі людзьмі па-за межамі дому. Не выходзьце з дому, калі ў гэтым няма асаблівай патрэбы.

Каб скараціць выхады, можна выкарыстоўваць наступныя меры:

* кантактуйце з іншымі людзьмі дыстанцыйна з дапамогай сродкаў сувязі;

* выбірайце паслугі дастаўкі — толькі да парога кватэры (дома, офіса);

* аддаленая работа, відэазванкі і канферэнцсувязь.

2. Калі ёсць неабходнасць выйсці з дому, скарацiце кантакты з іншымі людзьмі і захоўвайце 1,5-метровую адлегласць адзін ад аднаго. Калі гэта немагчыма, выкарыстоўвайце маску.

3. Як мага часцей мыйце рукі з мылам (пры адсутнасці такой магчымасці выкарыстоўвайце сродак для дэзынфекцыі або антысептычны сродак для апрацоўкі рук).

4. Выконвайце «рэспіраторны этыкет».




Асобныя рэкамендацыі для людзей з групы высокай рызыкі — асоб старэйшага і пажылога ўзросту, пацыентаў з хранічнымі захворваннямі любога ўзросту (паталогіі органаў дыхання, сардэчна-сасудзістай, імуннай сістэм, анкалагічныя захворванні, бранхіяльная астма). Ім не варта выходзіць з дому, калі ў гэтым няма асаблівай патрэбы (паездкі на работу, пакупка прадуктаў харчавання і лекаў, атрыманне медыцынскіх і іншых жыццёва важных паслуг). Таксама не рэкамендуецца прымаць нікога ў сябе дома, за выключэннем атрымання жыццёва важных паслуг. Папрасіце родных і знаёмых дапамагчы вам з забеспячэннем бытавых патрэб.

### Дадатковыя рэкамендацыі

Пазбягайце фізічных кантактаў, уключаючы поціск рукі і абдымкі.

Адкрывайце дзверы не далонямі. Паспрабуйце не дакранацца рукамі да твару.

Як мага часцей праветрывайце памяшканні. Праводзьце дэзынфекцыю кантактных паверхняў, асабліва дзвярных ручак, пультаў тэлевізара, тэлефонаў, камп'ютарнай клавіятуры і іншых паверхняў, да якіх мы дакранаемся часта.

Паспрабуйце не курыць, у тым ліку электронныя цыгарэты або кальян.

Не карыстайцеся агульнымі сталовымі прыборамі, не ешце з адной талеркі і не перадавайце іншым ежу, якую вы пакаштавалі або адкусілі.

Знаходзячыся дома, прытрымлівайцеся здаровага харчавання і фізічнай актыўнасці.

Пры з'яўленні сімптомаў рэспіраторнага захворвання (павышэнне тэмпературы цела, кашаль, задышка, насмарк) захоўвайце хатнюю самаізаляцыю, пазбягаючы кантактаў з членамі сям'і, і выклікайце ўрача.

*У Беларусі на 25 верасня зафіксавана 76 957 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. Прырост за апошнія суткі склаў 306 новых выпадкаў. Паправіліся і выпісаны 73 925 чалавек, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ (192 за апошнія суткі), 807 чалавек з каранавіруснай інфекцыяй у краіне памерла (пяць чалавек за апошнія суткі). З пачатку распаўсюджання інфекцыі праведзена 1 млн 792 тыс. 426 тэстаў (16 155 за суткі).*

**Алена КРАВЕЦ.**

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 7 (106)



Бяспека

# АДБІЦЬ АТАКУ РАЗАМ

**Прайшоў другі этап вучэнняў «Славянскае братэрства-2020». Ён адбыўся ў форме аператыўна-тактычнага вучэння. Сёлета ў ім бралі ўдзел вайскоўцы з Беларусі і Расіі. З нашага боку гэта былі ваеннаслужачыя Заходняга аператыўнага камандавання, Сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны, ракетных войскаў і артылерыі. Расія была прадстаўлена двума злучэннямі паветрана-дэсантных войскаў.**

Асноўная накіраванасць вучэння — вядзенне сумесных дзеянняў у інтарэсах забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы. На гэтым этапе імі **кіраваў намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Сяргей ПАТАПЕНКА.** Усяго было задзейнічана каля шасці тысяч вайскоўцаў і звыш за 500 адзінак баявой тэхнікі.



Падчас другога этапу вучэнняў адпрацоўваліся пытанні кіравання войскамі падчас адбіцця ўзброенай агрэсіі ва ўмовах зменлівай абстаноўкі. Так, зводная беларуска-расійская тактычная група вызваляла гідратэхнічны вузел, захоплены ўмоўным праціўнікам. Быў высаджаны дэсант, а ўчастак ракі пераадольваўся на баявой тэхніцы.

Падчас вучэнняў была задзейнічана і авіяцыя. Аб яе працы расказаў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Ігар ГОЛУБ:**

— Адпрацаваны шэраг задач, якія выконвалі дзяжурныя сілы па супрацьпаветранай абароне Ваенна-паветраных сіл сумесна з нашымі расійскімі калегамі. Таксама здзейснены авіяцыйныя ўдары з мэтай ліквідацыі незаконных узброеных фарміраванняў умоўнага праціўніка. Суправаджаліся і самалёты транспартнай авіяцыі, якія высаджвалі дэсант у зададзеным раёне.

Падчас вучэнняў былі задзейнічаны некалькі палігонаў, у тым ліку «Ружаны», «Брэсцкі», «Гожскі», «Абуз-Лясноўскі». За адным з эпізодаў другога этапу вучэнняў назіралі акрэдытаваныя пры Міністэрстве абароны замежныя ваенныя дыпламаты.



— На палігоне «Брэсцкі» замежным прадстаўнікам быў дадзены брыфінг, — адзначылі ў Міністэрстве абароны. — Ён змяшчаў падрабязную інфармацыю аб сумесным вучэнні, якое праходзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 22 да 25 верасня. Ваенныя дыпламаты змаглі назіраць за дзеяннямі войскаў, работай дэсанта, захопам і ўтрыманнем плацдарма для забеспячэння контрнаступлення з мэтай аднаўлення першапачатковага становішча, а таксама авіяцыйнай падтрымкай. Пры гэтым трэба адзначыць, што яшчэ 21 верасня Беларусь накіравала дзяржавам — удзельніцам АБСЕ інфармацыю пра вучэнне «Славянскае братэрства — 2020», нягледзячы на тое што па яго параметрах рабіць гэта было неабавязкова. Звесткі былі абвешчаны ў якасці жэсту добрай волі ў інтарэсах забеспячэння транспарэнтнасці ваеннай дзейнасці, якая ажыццяўляецца на тэрыторыі нашай дзяржавы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**

У развіцці

# Ахоўнікі беларускага паветра

**Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны заўжды лічыліся элітай арміі. Ды і задачы на іх ускладзены вельмі вялікія. Самая галоўная — забяспечваць спакой на паветраных межах краіны. А каб паспяхова яе выканаць, патрэбна доўгая і карпатлівая папярэдняя праца.**

**Нашы лётчыкі рыхтуюцца на вельмі высокім узроўні. Найлепшае сведчанне гэтаму — не толькі дзясяткі паспяхова праведзеных вучэнняў, але і выдатныя вынікі выступленняў на Армейскіх міжнародных гульнях. Сёлета нашы авіятары занялі на іх выніковае другое месца, прычым штурмавікі наогул падзялілі першае месца з расіянамі.**

**Пра эвалюцыю Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны ў гісторыі суверэннай Беларусі «Звяздзе» расказаў камандуючы Ігар ГОЛУБ.**



Знішчальнік Су-30СМ пачынае палёт.

### Доўгі арганізацыйны шлях

— Пасля распаду СССР на тэрыторыі Беларусі засталася магутная авіяцыйная групоўка. Яна ўключала ў свой склад знішчальную і бамбардзіровачную авіядывізіі, дзесяць асобных авіяцыйных палкоў розных родаў авіяцыі, сем асобных авіяэскадрылляў, каля 80 авіяцыйных часцей забеспячэння, — узгадвае Ігар Голуб. — Агульная колькасць асабовага складу дасягала 25 тысяч вайскоўцаў. Фарміраванне Ваенна-паветраных сіл ужо незалежнай Беларусі было распачата загадам міністра абароны ад 15 чэрвеня 1992 года. Пачалося яно на базе 26-й паветранай арміі. І амаль адразу ж стала праводзіцца іх трансфармацыя пад новыя ўмовы. Так, ужо налета была выпрацавана канцэпцыя, па якой авіяцыйныя палкі і часці забеспячэння перафарміроўваліся ў авіяцыйныя базы.

Рэфармаванне доўжылася ўсе 1990-я. Кіраўніцтва краіны прыняло рашэнне аб яго заканчэнні ў 2001-м. За гэты час была праведзена сур'ёзная тэарэтычная падрыхтоўка. Ваенныя аналітыкі правялі цэлую серыю навукова-практычных канферэнцый і эксперыментаў. Гэта ўсё замацоўвалася на практыцы падчас шэрагу вучэнняў, галоўным з іх стала «Нёман-2001».

— Яно паказала сябе сапраўдным дзяржаўным іспытам на здольнасць прымаць і выконваць новыя падыходы. Пры гэтым аператыўна-тактычнаму вучэнню быў нададзены даследчы характар. Яго асаблівасцю стала тое, што ўпершыню была апрабаваная праца аб'яднанага штаба Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны, — адзначыў Ігар Голуб. — Гэты досвед быў карпатліва прааналізаваны. І ўжо ў лістападзе 2001-га Указам Прэзідэнта былі створаны адзіны від Узброеных Сіл — Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны.

Налета прайшло вучэнне «Бярэзіна-2002», дзе новаствораны від войскаў ужо паўнавартасна выконваў задачы ў сваёй новай арганізацыйна-штатнай структуры. Многія пытанні даводзілася вырашаць з даданнем слова «ўпершыню». У сваю чаргу, гэта накладвала дадатковую адказнасць і стварала пэўныя цяжкасці.

— Падчас вучэння «Чыстае неба — 2003» быў зроблены акцэнт на ўжыванні ВПС і войскаў ППА падчас правядзення ўмоўным праціўнікам паветранай кампаніі. І тады стала ясна: такая групоўка пад кіраўніцтвам органаў ваеннага кіравання — камандавання віду Узброеных Сіл — дазваляе адбіць масіраваныя ракетна-авіяцыйныя ўдары паветранага праціўніка і стварыць умовы для зрыву яго наступальнай аперацыі, — падкрэсліў Ігар Голуб.

Зараз жа Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны працягваюць развівацца як вельмі важны від Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Іх асноўная задача — заваяваць і ўтрымаць панаванне ў паветры пры адбіцці любой ваеннай пагрозы ў дачыненні да Беларусі, а таксама прыкрыць ад удараў з паветра войскі і стратэгічна важныя аб'екты краіны. У сучасным няпростым ваенна-палітычным становішчы сілы супрацьпаветранай абароны становяцца не проста шчытом ад ракетна-авіяцыйнай пагрозы. Можна сказаць, што яны займелі статус вырашальнага фактару стрымлівання агрэсіі.

Зыходзячы з гэтага, Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны і сталі развівацца далей.

Падрыхтоўка цяпер у асноўным скіравана на падтрыманне неабходнага ўзроўню баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці, павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі органаў ваеннага кіравання, злучэнняў і вайсковых часцей. Акцэнт таксама робіцца на далейшае ўдасканаленне іх гатоўнасці і здольнасці выконваць задачы па прызначэнні, у тым ліку ў складзе рэгіянальнай групоўкі войскаў. А каб павысіць эфектыўнасць баявога выкарыстання, была аптымізавана арганізацыйна-штатная структура і створана аўтаматызаваная сістэма кіравання войскамі ад аператыўна-стратэгічнага да тактычнага ўзроўню. Яна дазволіла кіраваць войскамі ў рэальным маштабе часу і стварыла магчымасць перадаваць кіраванне на іншыя пункты. Пры гэтым, натуральна, яна захоўвае вялікую жывучасць ва ўмовах агнявога і радыёэлектроннага ўздзеяння саперніка.

### Неба скарае прагрэс

Тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы. І калі на 90-я гады авіяцыйная тэхніка ў Беларусі была сучасная, то чым далей ішоў час, тым істотней змяняліся патрабаванні да яе — зрэшты, як ва ўсіх родах і відах войскаў. Таму было прынята рашэнне мадэрнізаваць існуючыя ўзоры лятальных апаратаў і пры неабходнасці закупляць новыя. Мадэрнізацыя праходзіла пры ўдзеле прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу Беларусі.

І вось тут спраўдзілася вядомая прымаўка, сэнс якой у тым, што новае часам бывае даўно вядомае. Гэта датычыцца пасадак самалётаў на аўтадарогах агульнага карыстання. У 2016 годзе штурмавік Су-25 выканаў яе ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі. Праз чатыры гады рэкорд быў перасягнуты ў тым, што ўпершыню на аўтадарогу пасадзіў вучэбна-трэніровачны самалёт Л-39 курсант авіяцыйнага факультэта Ваеннай акадэміі Арцём Чарніцкі.

— Што да мадэляў тэхнікі, то ў апошняе дзесяцігоддзе ў авіяцыйныя воінскія часці паступілі сучасныя вучэбна-баявыя самалёты Як-130, транспартна-баявыя верталёты Мі8-МТВ5, шматмэтавыя знішчальнікі Су-30СМ. Больш за тое, павялічыліся баявыя магчымасці зенітных ракетных брыгад, якія атрымалі на ўзбраенне сучасныя зенітныя ракетныя комплексы «Тор-М2» і С-300ПС, якія прайшлі капітальны рамонт, — заўважыў Ігар Голуб. — У сваім класе зенітнага ракетнага комплексу «Тор-М2», па сутнасці, няма роўных у свеце. Ён прызначаны для эфектыўнай барацьбы з ракетамі класа «паветра — зямля», авіябомбамі, якія кіруюцца і карэктуюцца, супрацьрадыёлакацыйнымі ракетамі і іншай высокадакладнай зброяй новага пакалення, самалётамі тактычнай і вайсковай авіяцыі, крылатымі ракетамі, верталётамі, беспілотнымі лятальнымі апаратамі...

Ракеты зенітнага ракетнага комплексу, якія стаяць на ўзбраенні ў беларускім войску, здольныя паражаць цэлі ва ўмовах радыёэлектроннага процідзеяння, а таксама адбіваць масіраваныя ракетныя авіяцыйныя ўдары. Павышаныя тэхнічныя і праграмныя магчымасці дазваляюць выяўляць цэлі, пры стварэнні якіх максімальна выкарыстоўваліся нават стэлс-тэхналогіі.

— Магчымасці падраздзяленняў радыётэхнічных войскаў істотна павялічылі прынятыя на ўзбраенне радыёлакацыйныя станцыі новага пакалення «Саперснік-Г» і станцыі беларускай вытворчасці — «Усход-Д», «Раса-РБ». Яны дазваляюць выявіць усе сучасныя сродкі паветранага нападзення і перадаць пра іх інфармацыю для знішчэння падраздзяленнямі зенітных ракетных войскаў і авіяцыі, — лічыць Ігар Голуб.

Пры гэтым мадэрнізацыя існуючага ўзбраення і тэхнікі ідзе няспынна. Дзякуючы ёй паляпшаюцца тактыка-тэхнічныя характарыстыкі, узрастае абароненасць ад перашкод, пашыраецца кола задач, якое яна можа вырашыць. Сярод «разынак» — як мага большая аўтаматызацыя працэсаў кіравання і паступовы перавод на сучасную элементную базу.

— Што да міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, то камандаванне імкнецца ўстанавіць трывалыя сувязі з усімі зацікаўленымі дзяржавамі. Дзякуючы кантакам з прадстаўнікамі адпаведных відаў замежных Узброеных Сіл была павышана эфектыўнасць ўзаемадзеяння па абмене інфармацыяй аб палётах паветраных судоў, а таксама былі ўмацаваны меры даверу паміж краінамі-суседзямі, — адзначыў Ігар Голуб.



Пасадка самалёта на аўтадарогу М1 у Івацэвіцкім раёне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ПОГЛЯД ПРАЗ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

**На гэтым тыдні ў сярэдняй школе, што ў аграгарадку Слабада Смалявіцкага раёна, адкрылася ваенна-патрыятычная выстаўка «Пакаленне міру аб вайне і міры». Гэта частка маштабнага экспазіцыйна-выставачнага праекта «Памятаем. Ганарымся!», які быў ініцыяваны Дзяржаўным музеем гісторыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**

— Наш праект уключае ў сябе серыю тэматычных выставак у гарадах і пасёлках Беларусі, — расказаў **кіраўнік музея Сяргей АЗАРОНАК.** — Ён носіць сапраўды народны характар. З яго дапамогай мы хочам арганізаваць дыялог паміж двума пакаленнямі.

Выстаўка падзеленая на дзве часткі. Назва першай з іх надзвычай красамоўная — «Дзеці вайны гавораць». Там можна прачытаць выказванні дзяцей палка, партызан, вязняў гета, якім пашчасціла ацалець у ваенным ліхалецці; убачыць выявы людзей, якія маюць баявыя ўзнагароды. Другая частка выстаўкі прысвечана дзіцячай інтэрпрэтацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Хлопчыкі і дзяўчынкі перадаюць музею малюнкі на тэму вайны, рэчы сваіх продкаў, іх узнагароды, дзеляцца сямейнымі гісторыямі. Таксама ў рамках экспазіцыі дэманструюцца знаходкі пошукавых батальёнаў, музейныя экспанаты.

— Мы імкнёмся прыходзіць з нашым праектам менавіта ў школы, — кажа Сяргей Азаронак. — Гэтыя сустрэчы заўжды вельмі эмацыянальныя, паколькі дзеці могуць расказаць аб сваіх уражаннях лепш за дарослых і робяць гэта максімальна шчыра.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**



Беларусь памятае

# ПЕРШЫ ЛЕТАПІС ГЕРОЯЎ КРЭПАСЦІ НАД БУГАМ

## Стварыў пісьменнік Сяргей Смірноў

**Легендарная Брэсцкая крэпасць-герой стала ўвасабленнем стойкасці і мужнасці савецкіх воінаў, іх адданасці Айчыне. Неўмiручы подзвіг абаронцаў крэпасці першым праславіў вядомы пісьменнік-франтавік, лаўрэат Ленінскай прэміі, выдатны грамадскі дзеяч Сяргей Сяргеевіч Смірноў, з дня нараджэння якога прайшло ўжо 105 гадоў. Яго кніга «Брэсцкая крэпасць» была і застаецца папулярным творам пра вайну, пра доблесных абаронцаў Радзімы.**



Нарадзіўся Сяргей Смірноў у Петраградзе ў сям'і інжынера ў суровы час Першай сусветнай вайны. Працоўны шлях пачаў электраманцёрам на Харкаўскім электрамеханічным заводзе. У 1932—1937 гадах вучыўся ў Маскоўскім энергетычным інстытуце. Пачаў друкавацца ў 1934 годзе як журналіст, з 1937-га — супрацоўнік газеты «Гудок». З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны працаваў на абаронным заводзе. У 1942-м пайшоў добраахвотнікам у знішчальны батальён, потым скончыў школу снайпераў у Падмаскоўі, вучылішча зенітнай артылерыі ва Уфе, са студзеня 1943-га камандаваў узводам у 23-й зенітна-артылерыйскай дывізіі. Лейтэнантам ваяваў на Дняпры, удзельнічаў у Корсунь-Шаўчэнкаўскай бітве, нямала прайшоў па франтавых дарогах у Венгрыі. За ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм спецыяльны карэспандэнт рэдакцыі газеты «Мужество» 27-й арміі Сяргей Смірноў быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі.

У пасляваенны час скончыў Літаратурны інстытут імя Горкага, працаваў рэдактарам «Ваенвыдата», у 1950 годзе быў звольнены з Узброеных Сіл СССР у званні падпалкоўніка. У 60—70-х гадах мінулага стагоддзя — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Новый мир», галоўны рэдактар «Литературной газеты», сакратар Маскоўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР, член праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, член рэдкалегіі часопіса «Смена». Тэме вайны прысвечаны яго кнігі «На палях Венгрыі», «Сталінград на Дняпры», «У пошуках герояў Брэсцкай крэпасці», «Былі Вялікай вайны», «Сям'я», а таксама шэраг п'ес і кінасцэнарыяў. Агульнапрызнана, што пісьменнік і журналіст Сяргей Смірноў фактычна адкрыў свету подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

«У 1954 годзе, — успамінаў Сяргей Смірноў, — я зацікавіўся тады яшчэ смутнай легендай аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці і пачаў шукаць удзельнікаў і відавочцаў гэтых падзей. Праз два гады я расказаў аб гэтай абароне і аб абаронцах Брэста ў серыі радыёперадач «У пошуках герояў Брэсцкай крэпасці», якія атрымалі шырокі водгук у народзе. Паток лістоў, якія даслалі мне пасля гэтых перадач, налічваў спачатку дзясяткі, а потым сотні тысяч...» Амаль не раздумваючы, Смірноў узяўся за напісанне кнігі пра подзвіг Брэсцкай крэпасці. Потым ён напіша: «Павінен сказаць, што тэма Брэсцкай крэпасці неяк адразу захапіла мяне. У ёй адчувалася прысутнасць вялікай і неразгаданай таямніцы, адкрывалася велізарнае поле для пошукаў, для нялёгкай, але займальнай даследчай работы. Адчувалася, што гэта тэма наскрозь прасякнута высокім чалавечым гераізмам, што ў ёй неяк асабліва ярка выявіўся гераічны дух нашага народа, нашай арміі».

Галоўная заслуга пісьменніка ў тым, што ён у пачатку 50-х гадоў прошлага стагоддзя самым першым у нашай краіне пачаў пошук невядомых герояў. Мільёны людзей слухалі па радыё яго «Аповеды пра невядомых герояў», «У пошуках герояў Брэста», а ў 1960-я глядзелі па тэлевізары яго тэлеальманах «Подзвіг». У многіх савецкіх сем'ях былі зніклыя без вестак. Выступленні Смірнова ў друку, на радыё і тэлебачанні ўнеслі вялікі ўклад у пошук зніклых у гады вайны і яе невядомых герояў. Гэтыя хвалюючыя перадачы слухала без перабольшання ўся краіна. Больш за трыста ўдзельнікаў абароны ўдалося адшукаць пісьменніку.

Ён звыш дзесяці гадоў збіраў інфармацыю пра лёс удзельнікаў і пра ход падзей лета 1941 года ў цытадэлі. Дзякуючы дакументам, падрыхтаваным пісьменнікам, каля 70 абаронцаў Брэсцкай крэпасці атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды. У сярэдзіне шасцідзясятых гадоў гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці і яе герояў Сяргей Смірноў расказаў у дакументальнай кнізе «Брэсцкая крэпасць». У ёй вельмі падрабязна ўзноўлены ўвесь ход абарончых баёў у крэпасці, прасочаны лёсы герояў гэтай абароны, як загінулых, так і тых, хто застаўся жывы. Папярэднічае кнізе адкрыты ліст героям Брэсцкай крэпасці, у якім аўтар піша: «Я быў удзельнікам вайны і нямала бачыў у тыя памятныя гады. Але менавіта подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці нібы новым святлом асвяціў усё ўбачанае, раскрыў мне сілу і шырыню душы нашага чалавека, прымусіў з асаблівай вастрынёй перажыць шчасце і гонар усведамлення прыналежнасці да вялікага, высакароднага і самаахвярнага народа, здольнага тварыць нават немагчымае». Шматгадовая пошукавая работа падштурхнула Смірнова да ідэі стварэння Музея абароны Брэсцкай крэпасці, які быў адкрыты 8 лістапада 1956-га. Сюды ён перадаў больш за паўсотні папак з лістамі, сшыткі і нататнікі з запісамі гутарак з удзельнікамі тых баёў, сотні фатаграфій. Самае прамое дачыненне да стварэння музея мае Пётр Машэраў, які ў той час быў першым сакратаром Брэсцкага абкама партыі. Ён пасябраваў з пісьменнікам Смірновым, аказваў неабходную дапамогу, вёў з ім доўгія даверлівыя размовы пра вайну, пра планы на будучыню. У 1964 годзе кніга «Брэсцкая крэпасць», якая толькі што выйшла з друку ў Маскве, была падорана аўтарам Машэраву з надпісам: «Дарагому Пятру Міронавічу і яго слаўнай сям'і з маёй любоўю і моцным сяброўствам. Вы так шмат зрабілі, каб гэтая кніга была напісана. Дзякуй! Ваш Смірноў».

Да 20-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне з'явілася перадача «Подзвіг» — новы альманах Цэнтральнага тэлебачання. Перадачы прысвячаліся памятным падзеям вайны, асобным родам войскаў, былым франтавікам і партызанам, «чырвоным следапытам», якія ідуць у паходы па дарогах вайны, гарадах-героях. Першым вядучым альманаха быў пісьменнік Сяргей Смірноў. З сярэдзіны 1960-х і на працягу некалькіх гадоў ён быў вядучым радыё- і тэлеперадачы «Аповеды пра гераізм».

25 верасня 1971 года адбылося ўрачыстае адкрыццё Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», на якім прысутнічалі больш за 600 ветэранаў. Сярод ганаровых гасцей быў і Сяргей Смірноў. У сваім прывітальным слове ён сказаў: «Велічны мемарыял сімвалізуе сілу вашага духу, подзвіг усяго легендарнага гарнізона. Подзвіг, які вы здзейснілі тут, назаўжды застанецца ў памяці нашага народа, таму што гэта крэпасць, гэта зямля, палітая вашай крывёю, сталі месцам, куды прыязджае цяперашняя моладзь — пакланіцца славе герояў, вучыцца ў іх мужнасці, уменню абараняць сваю сацыялістычную Радзіму...»

У народзе жыве памяць пра пісьменніка-франтавіка: у гонар Смірнова названа вуліца ў Брэсце, у Музеі Брэсцкай крэпасці пісьменніку прысвечана асобная экспазіцыя, на доме, у якім ён жыў у Маскве, устаноўлена памятная дошка. Пісьменнік-патрыёт узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі СССР. Памёр Сяргей Сяргеевіч у 1976 годзе ў Маскве, пахаваны на Новадзявочых могілках. На помніку пісьменнік намаляваны на фоне Холмскіх варот, пагладваючы твары абаронцаў крэпасці.

Сапраўдным нерукатворным помнікам пісьменніку і яго пошукавай дзейнасці стаў сумесны расійска-беларускі фільм «Брэсцкая крэпасць», выпушчаны да 65-годдзя Вялікай Перамогі. Прэм'ера кінастужкі адбылася 22 чэрвеня 2010 года ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» каля Цярэспальскіх варот, а таксама на Мінскім Міжнародным кінафестывалі «Лістапад».

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
**член Беларускага саюза журналістаў.**

Маладзёжны рух

# ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ: АБ ТРАДЫЦЫЯХ І БУДУЧЫНІ

**Святочны канцэрт, прысвечаны 100-годдзю камсамола Беларусі, прайшоў у Мінску. На сустрэчу сабраліся кіраўнікі дзяржаўных органаў, ветэраны камсамольскага руху (якія, дарэчы, прыехалі з розных куткоў краіны) і іх пераемнікі — актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, а таксама шматлікія іншыя ахвотныя. На ўрачыстым вечары ў Доме афіцэраў для многіх з'явілася магчымасць убачыць сваіх старых сяброў, успомніць цёплыя моманты студатрадаўскага жыцця.**



Старт мерапрыемству даў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.** Вітаючы гасцей, ён падкрэсліў, што Ленінскі камуністычны саюз моладзі адыграў у гісторыі нашай дзяржавы вельмі важную ролю.

— Менавіта маладая энергія, энтузіязм і гарачае жаданне рухаць сваю краіну наперад дазвалялі камсамольцам савецкага часу брацца за рэалізацыю самых амбіцыйных і складаных праектаў: ад асваення цалінных зямель да будаўніцтва прамысловых гігантаў і магістраляў. І па вялікім рахунку сёння, нават калі прайшло ўжо столькі гадоў, асновай эканамічнага патэнцыялу многіх дзяржаў на постсавецкай прасторы з'яўляецца спадчына ўдарных камсамольскіх будоўляў. Беларусь — не выключэнне. Але галоўнае тое, што камсамол аб'ядноўваў і зараджаў шчырым гонарам за сваю Бацькаўшчыну, сапраўдным патрыятызмам і верай у свой народ.

Андрэй Кунцэвіч працытаваў словы з вядомай камсамольскай песні «Была бы страна — и нету других забот», якія актуальныя і сёння.

— Зараз беларусаў упарта спрабуюць сутыкнуць ілбамі, пераканаць у тым, што ў нас не тая ўлада, не той сцяг, не той саюз моладзі. Мы выдатна ведаем, чым заканчваецца такая рыторыка — разбурэннем духоўных і светапоглядных асноў грамадства, а за ім — і дзяржавы. Таму абараняючы нашы каштоўнасці і сімвалы, гісторыю і традыцыі, мы захоўваем нашу краіну, нашу любімую Беларусь, у якой, як мы маглі пераканацца, моцны Прэзідэнт, мудры народ, выдатная моладзь, а значыць, ёсць і будучыня.

Святочны вечар быў падзелены на некалькі тэматычных блокаў: «Камсамольскія сэрцы», «Вернасць», «Слава», «Любоў», «Сяброўства» і «Маладосць». Прысутныя ўспаміналі гісторыю развіцця камсамольскага руху, спявалі і танцавалі... Ветэраны, размаўляючы паміж сабой і з малодшым пакаленнем, адзначылі, што апошнія сталі для іх годнай зменай.

— Сучасная моладзь, хоць і не сто працэнтаў, але падтрымлівае нашы традыцыі, — падзяліўся **ветэран камсамольскага і студатрадаўскага руху Аляксандр СТАСЕНЯ.** — Яны прымаюць удзел у рабоце студэнцкіх атрадаў, працуюць у сельскай гаспадарцы. Нават адзначыліся на будоўлі Беларускай атамнай станцыі. Гэта заслугоўвае павагі.

Падчас сустрэчы з найбольш актыўным прадстаўніком пераемніка камсамола — Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — Андрэй Кунцэвіч уручыў ганаровыя граматы Адміністрацыі Прэзідэнта. А пасля для ўсіх гасцей у выкананні салістаў Нацыянальнага канцэртнага акадэмічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга прагучалі вядомыя некалькім пакаленням песні.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.**

---

Люстэрка лёсу

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

# З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

## Леанід Аляксандравіч ЛАТОЦІН

...Лёня старэйшы за мяне на чатыры гады, і так склалася, што мы з ім вучыліся разам у аспірантуры ў прафесара Столяра. Гэта нас зблізіла яшчэ болей. У свайго навуковага кіраўніка мы былі ў ролі ад'ютантаў. Суправаджалі яго ў паездках на канферэнцыі, асісціравалі на навуковых семінарах, сустракалі і праводзілі яго гасцей з усяго Савецкага Саюза. Было вельмі цікава займацца навукай, кантактаваць з разумнымі, высокаадукаванымі людзьмі. Тады на базе нашага фізмата рэгулярна праводзіліся канферэнцыі рэспубліканскага і ўсесаюзнага маштабу найперш таму, што ў інстытуце працаваў прафесар Столяр. Гэта быў, безумоўна, вучоны сусветнага маштабу, і мы з Лёнем стараліся яму дапамагаць ва ўсім. Як правіла, суправаджалі Абрама Аронавіча і на традыцыйных банкетах пасля канферэнцый. На пэўнай стадыі падпітку Латоцін заўсёды распачынаў адну і тую ж песню «Сабраліся прымакі і пайшлі тапіцца...» Лёня заўсёды ўсё рабіў з азартам, і гэту песню выконваў самазабыўна. Але не магу не сказаць, што слухаў я яго з задавальненнем, паколькі сам у гэты перыяд жыў у цешчы.

Леанід Аляксандравіч стаў загадваць кафедрай методыкі выкладання матэматыкі ў 1989 годзе, пасля прафесара Столяра. Ён сам шмат працаваў, патрабаваў вынікаў і ад астатніх. На кафедры вялася інтэнсіўная навукова-метадычная работа, абараняліся дысертацыі, друкаваліся навучальныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы. Два пяцігадовыя тэрміны загадвання Латоціна прайшлі без праблем. Ён планаваў застацца загадчыкам і на трэці тэрмін, але нечакана для яго і для нас узніклі складанасці. На кафедры сфарміравалася апазіцыя загадчыку, якая прапанавала Леаніда Аляксандравіча на трэці тэрмін не рэкамендаваць. Я ў гэты час працаваў першым прарэктарам універсітэта, курыраваў кадравыя пытанні і абавязаны быў у сітуацыю ўмяшацца. На гэтай кафедры працавалі яшчэ мае студэнцкія сябры, былыя мае аспіранты, але я не стаў праз іх высвятляць прычыны супрацьстаяння Латоціну і тым болей не планаваў сутыкнення яго прыхільнікаў і праціўнікаў. Проста прыйшоў на пасяджэнне кафедры і адразу, нават нікога не выслухаўшы, сказаў:

— Я, як першы прарэктар, павінен патрабаваць ад загадчыка кафедры рэзультатыўнай работы. Асабіста я — ад яго і ад усіх яго супрацоўнікаў. Па ўсіх паказчыках ваша кафедра найлепшая ва ўніверсітэце. Таму, рэкамендуеце вы Леаніда Аляксандравіча на наступны тэрмін ці не, я ўсё роўна на Савеце ўніверсітэта буду адстойваць яго кандыдатуру. І ўпэўнены, што практычна ўсе члены Савета маё меркаванне і меркаванне рэктара, якое я тут таксама прадстаўляю, падтрымаюць.

Кафедра Латоціна рэкамендавала, ён усяго загадваў ёю дваццаць гадоў. З Леанідам Аляксандравічам звязана і маштабная эпапея падрыхтоўкі навучальных дапаможнікаў па матэматыцы для сярэдняй школы. Такая задача ўзнікла адразу пасля набыцця нашай краінай незалежнасці. Патрабаваліся свае нацыянальныя падручнікі па ўсіх прадметах. Мы з Б. Д. Чабатарэўскім да гэтага часу ўжо былі суаўтарамі некалькіх навучальных дапаможнікаў для студэнтаў па алгебры і тэорыі лікаў, і Міністэрства адукацыі прапанавала нам стварыць аўтарскі калектыў для падрыхтоўкі вучэбнага комплексу па матэматыцы для 5—7 класаў. У нас двух нават сумненняў не было ў тым, што без Латоціна нам з гэтай задачай не справіцца. Ён пагадзіўся, а я вымушаны быў як прарэктар заняцца працэсам пераходу нашага педінстытута ў статус універсітэта, пасля падрыхтоўкай доктарскай дысертацыі, у выніку Латоцін і Чабатарэўскі засталіся ў гэтым праекце ўдвух. І яны бліскуча справіліся з задачай: падрыхтавалі навучальныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў, дадатковую літаратуру па матэматыцы, прычым для 5—11 класаў сярэдняй школы. Гэтыя дапаможнікі вытрымалі 18 выданняў на беларускай і рускай мовах. Па родзе сваёй службы я вывучаў шмат падобных прац і смела сцвярджаю, што ў Чабатарэўскага і Латоціна яны высакакласныя.

Я любіў слухаць Леаніда Аляксандравіча на навуковых семінарах. Ён заўсёды да іх грунтоўна рыхтаваўся. Напрыклад, шмат каму з нас для навуковай работы патрэбны былі статыстычныя метады для разумення і ацэнкі рэзультатаў педагагічных даследаванняў. Лепей за ўсіх імі валодаў Латоцін. Больш за тое, па нашай просьбе ён падрыхтаваў курс лекцый і на спецыяльным семінары падрабязна азнаёміў усіх ахвотных з навуковымі асновамі гэтых метадаў.

Леанід Аляксандравіч — працаголік ва ўсім. Наш з ім агульны сябра, дырэктар магілёўскага ліцэя № 1, таксама былы аспірант прафесара Столяра, Пётр Шылаў расказваў мне, што быў на лецішчы Латоціных. Такога ідэальнага ўчастка, арганізаванага ў выглядзе тэрас па ўсіх правілах мастацтва агародніцтва, ён у жыцці сваім не бачыў.

Я да канца не ведаю прычын, па якіх Леанід Аляксандравіч, ужо амаль сямідзесяцігадовы, пайшоў з нашага фізмата ў Магілёўскі інстытут МУС. Там ён працуе дацэнтам кафедры аператыўна-пошукавай дзейнасці, вучыць будучых афіцэраў міліцыі логіцы мыслення. Ім пашчасціла, Латоцін заўсёды вучыць якасна, з уласцівымі яму настойлівасцю і азартам.

А я ўпэўнены, што і гэта яго не апошняе захапленне.

## Васіль Васілевіч ПЯТРОЎ

На нашым фізмаце Васіль Васілевіч Пятроў дэманстраваў сабой найвышэйшы ўзровень інтэлекту і гранічную сціпласць. У яго было суровае дзяцінства і, увогуле, няпросты лёс. Аднойчы да фізматаўскай першакрасавіцкай «Гумарыны» мы задумалі выпусціць насценную газету з назвай «Калі мы былі маладыя...» Папрасілі калег-выкладчыкаў прынесці свае фотаздымкі, дзе яны былі адлюстраваны маленькімі, яшчэ дзецьмі. Ідэя аказалася не толькі цікавай, але яшчэ і кранальнай. Выкладчыкі прыносілі фотаздымкі, дзе яны ў дашкольным узросце, у малодшых класах. Былі фотаздымкі і даваенныя, і зробленыя адразу пасля вайны, дзе дзеці нават апранутыя былі ў вайсковую форму. Прынёс фотаздымак і Васіль Васілевіч. На ім была пара шчаслівых маладых людзей, мужчына і жанчына, з малечай на руках. Пятроў са слязамі на вачах стаў нам тлумачыць: «Гэта мае бацькі, а я ў іх на руках. Фотаздымак зроблены ў 1937 годзе. У гэтым самым годзе бацьку і маці арыштавалі, болей я іх ніколі ў жыцці не бачыў. І нічога не ведаю пра іх лёс».

Васіль Васілевіч спецыялізаваўся на тэарэтычнай фізіцы. Лекцыі чытаў самазабыўна. У мяне складвалася ўражанне, што ўсе гэтыя складаныя формулы і іх рашэнні проста «вынікаюць» з яго самога. Ён ніколі ні ў якія канспекты не падглядваў, не збіваўся, не блытаўся. Высокі клас выкладчыка ВНУ! Яго навуковыя зацікаўленні былі ў касмалогіі, у фізіцы ўладкавання Сусвету — гравітацыйныя, электрамагнітныя палі, агульная тэорыя поля, чорныя дзіркі, калапсы зорак і шмат што іншае — усё вельмі далёкае і вельмі загадкавае. Усе гэтыя аб'екты і ўзаемадзеянне паміж імі Пятроў вывучаў на матэматычных мадэлях, што, безумоўна, патрабавала шырокіх спецыяльных ведаў і напружанай працы. Вынікі сваіх даследаванняў ён рэгулярна друкаваў у аўтарытэтных усесаюзных і замежных навуковых часопісах. Але кандыдацкую дысертацыю Васіль Васілевіч так і не абараніў. Ён быў для мяне настолькі паважаны вучоны, што не толькі дапамагаць яму, але нават пытаць яго пра работу над дысертацыяй я не мог.

Фізмат шанаваў, паважаў Пятрова і як узорнага сем'яніна. Ён вельмі апекаваўся і над сваёй жонкай, і над сваімі дзецьмі. Не, падкаблучнікам ён не быў. Мы ўсе бачылі, што не толькі ў калектыве, але і ў жыцці, у тым ліку і ў сям'і, ён быў сапраўдны інтэлігент.

Здаралася, што Васіль Васілевіч чытаў астраномію, а пасля смерці К. К. Жыліка яму ўвогуле даручылі гэты курс. Вось праз Пятрова я і даведаўся, што ў нас, у інстытуце, ёсць усё ж такі вельмі магутны тэлескоп. Ён яго распакаваў, сабраў, наладзіў і арганізаваў для студэнтаў назіранні за зорным небам. І не толькі для студэнтаў, але і для ўсіх ахвотных палюбавацца дзіўнай прыгажосцю космасу таксама. Аднойчы ён і мяне літаральна выцягнуў з кабінета, узрушана заявіўшы, што такія падзеі ў жыцці прапускаць нельга. І мы з ім проста каля вучэбнага корпуса ў тэлескоп назіралі праходжанне Венеры па сонечным дыску. Маё захапленне астраноміяй — ад Жыліка і Пятрова. І яно не гасне з гадамі! У нас у сям'і ёсць свой тэлескоп, і мае дзеці, унукі, сябры, суседзі рэгулярна любуюцца характэрным рэльефам Месяца, «паласатым» Юпітэрам і яго спадарожнікамі, кольцамі Сатурна. Усе ведаюць і здольны паказаць на начным небе асноўныя сузор'і, беспамылкова адрозніваюць планеты ад зорак. І гэта ўсё таксама ад майго фізмата.

Была яшчэ адна смешная, ды і кранальная таксама гісторыя, звязаная з Васілём Васілевічам. Ён прыйшоў да мяне як да рэктара, каб падзяліцца нечаканай для яго радасцю. Увесь свяціўся ад шчасця. Далажыў, што яму прапануюць членства ў Нью-Ёркскай акадэміі навук. Шчыра здзіўляўся, як яны даведаліся пра яго навуковыя дасягненні, як высока іх ацанілі. Я, разумеючы, што гэта распаўсюджаны па тым часе «развод» на грошы, ціха пытаюся:

— Васіль Васілевіч, колькі?

Ён спачатку не разумее пытання. Я перапытваю:

— Колькі грошай яны просяць для першапачатковага ўзносу?

Васіль Васілевіч, прыходзячы ў сябе, сумна адказвае:

— Пяцьсот долараў. Але такіх грошай у мяне няма...

Васіль Васілевіч Пятроў — гэта непадробная шчырасць і чысціня майго фізмата.

**Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.**

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары ад 25 верасня)*

# Старажытныя артэфакты для нашчадкаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напрыклад, **загадчыца аддзела даследавання і рэстаўрацыі Аляксандра БАГАЛЕЙША** займаецца рэканструкцыяй старажытных ікон. І нядаўна падчас работы яна сутыкнулася з сапраўдным цудам. Ікона, якая трапіла на рэстаўрацыю, аказалася «з сакрэтам».

— Гэтая ікона доўгі час захоўвалася ў сховішчы і датуецца XIX стагоддзем. Але ніхто не ведаў, што пад верхнім пластом знаходзіцца яшчэ адзін спіс. Такім чынам, ікона аказалася з двайным спісам. Магчыма, што ніжні спіс яшчэ больш старэйшы, — мяркуе Аляксандра.



Яна расказала, што ікона трапіла на рэстаўрацыю для ўмацавання верхняга «залатога» пласта. Такая працэдура робіць фарбу больш трывалай. Калі спецыяліст стала праводзіць умацаванне, яна сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі — паверхня не паддавалася ніякім метадам. А калі зняла верхнюю фарбу, раптам праступіла яшчэ адно, ніжняе пісьмо. Тады рэстаўратарскі савет прыняў рашэнне перанесці верхні пласт на іншую аснову, для таго каб захаваць абедзве выявы. Ніжні спіс нядрэнна захаваўся, праўда, ён цёмны, але добра чытаюцца аблічы святых — у цэнтры бачны Хрыстос, Божая Маці, Мікалай-цудатворац, іншыя святыя. Верхні слой будзе сабраны на другой дошцы. Ён збіраецца як мазаіка — кожны кавалачак пераносіцца асобна.

**Каб захаваць гістарычную і культурную спадчыну, у Гродне будзе створаны адзіны ў краіне Цэнтр рэстаўрацыі. І будынак пад яго знайшлі адпаведны — прыгожы гістарычны асабняк канца XIX стагоддзя.**

— Для новай іконы быў выкарыстаны не вельмі добры грунт, таму пераносіць ранейшую выяву цяжка. Кожны пазл спачатку ачышчаю ад грунту. Затым размочваю, стоньшваю пакрыццё, сушу, перакладваю на другую дошку, — дэманструе Аляксандра даволі скрупулёзны працэс. — Спіс зроблены на аснове, якая імітуе золата. Зверху ікона пакрыта лакам.

Усяго ў фондах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея захоўваецца больш за дзве тысячы ікон, кажа суразмоўніца. Гэта даволі вялікая калекцыя. Між тым, многія паступілі ў крытычным стане, таму патрабуюць рэстаўрацыі. Пасля аднаўленчых работ іконы вяртаюцца назад, у фонды, час ад часу выстаўляюцца ў экспазіцыі. Аляксандра паказвае стос драўляных ікон, якія чакаюць свайго часу. Сярод іх ёсць трыпціхі-раскладушкі. Адна з ікон расколатая.



Керамікай займаецца Таццяна Багдановіч. Напрыклад, каб узнавіць збан ці іншы посуд, робіцца яго камп'ютарны праект, потым пластылінавы, а затым керамічны. Новы фрагмент спецыяльна адрозніваецца ад арыгінала, каб захаваць яго аўтэнтычнасць. Некаторыя рэчы набываюць патрэбную форму з невялікага чарапка. Такім чынам мы можам атрымаць уяўленне, як выглядаў гэты посуд у старажытнасці. Напрыклад, зараз на стале керамісткі нямала рэчаў, якія атрымалі другое жыццё і хутка трапяць у вітрыны музея.

Іван Кірыковіч займаецца рэстаўрацыяй археалагічных знаходак. Нядаўна яму трапіла накладка на кнігу XIII стагоддзя з херувімам. Такія знаходкі трэба пачысціць ад іржы і пакрыць палімернай смалой, каб яны не разваліліся. Гэта тонкая работа, карпатлівая.

Вядома, тут чакаюць новае абсталяванне для работы. А гэта — мікраскопы, лямпы, камп'ютары, сталы. Будзе набыта і спецыяльнае абсталяванне, у прыватнасці, фумігацыйная вакуумная камера для абеззаражвання прадметаў з паперы, дрэва, якія знойдзены падчас раскопак. Гэтыя рэчы загружаюцца ў камеру, выбіраецца спецыяльны рэжым, і прадмет ачышчаецца ад грыбка, адбываецца яго кансервацыя і вымарожванне. Такая апрацоўка асабліва патрэбная скураным вырабам, заўважае Іван Кірыковіч. Зараз ён працуе з прадметамі, якія знойдзены падчас раскопак на тэрыторыі Старога замка. Тут хутка адкрыецца экспазіцыя артэфактаў, куды трапяць і рэчы ад рэстаўратараў. У прыватнасці, вялікі старажытны куфар, механізм якога быў аднаўлены і будзе бачны.

— Тэрыторыя Старога замка — найбольш старажытнае паселішча горада, тут знойдзена нямала артэфактаў, якія мы хочам захаваць, — расказала **галоўны захавальнік фондаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Алена ЖАРЫНА.** — Калі мы ўсе прадметы адрэстаўруем, тады зробім спіс, створым агульную базу даных, якая будзе даступна на сайце. А фонды ў нас вельмі багатыя — больш за 200 тысяч цікавых і каштоўных прадметаў, многія з іх патрабуюць рэстаўрацыі на спецыяльным абсталяванні.

Каб захаваць гістарычную і культурную спадчыну, у Гродне будзе створаны адзіны ў краіне Цэнтр рэстаўрацыі. І будынак пад яго знайшлі адпаведны — прыгожы гістарычны асабняк канца XIX стагоддзя. Па словах новых уладальнікаў, раней дом належаў вядомаму ў Гродне лекару. Потым тут месціліся розныя ўстановы. Ад былой велічы амаль нічога не захавалася, акрамя печы з надзвычай прыгожай кафлі. У хуткім часе тут пачнецца маштабная мадэрнізацыя. Затым закупка абсталявання — ад мэблі і камп'ютараў да спецыяльных прыбораў і ўстановак. На гэта выдаткавана 550 тысяч еўра.

— Гэтыя сродкі паступяць у рамках трансгранічнага праекта. Партнёрам з'яўляецца Падляскі музей у польскім Беластоку. З праблемай рэстаўрацыйных цэнтраў сутыкнуліся абодва бакі, таму і вырашылі падаць сумесную заяўку, — паведаміла Алена Жарына. — Такім чынам быў распрацаваны вялікі інфраструктурны праект, падчас якога будуць створаны філіялы нашых музеяў, а па сутнасці — паўнавартасныя цэнтры рэстаўрацыі, даследаванняў і захавання помнікаў.

**Некаторыя рэчы набываюць патрэбную форму з невялікага чарапка. Такім чынам мы можам атрымаць уяўленне, як выглядаў гэты посуд у старажытнасці.**

Па словах суразмоўніцы, большасць абсталявання ў Беларусі не робіцца, як, напрыклад, ваккумны стол для рэстаўрацыі, кансервацыі прадметаў жывапісу, графікі, са скуры, тканіны. Яго можна закупіць толькі за мяжой. Таму пошукі будуць весціся сумесна з польскімі партнёрамі.

У Беларусі на сённяшні дзень няма такіх цэнтраў. Таму спецыялісты задаволены праектам, хоць прыйшлося прайсці даволі доўгі працэс падрыхтоўкі і ўзгадненняў. Плануецца рабіць сумесныя экспазіцыі тых артэфактаў, якія прайшлі рэстаўрацыю ў Гродне і ў Беластоку. Вядома, цэнтр будзе дапамагаць і іншым музеям рэгіёна. Штат рэстаўратараў амаль укамплектаваны, не хапае толькі таксідэрміста.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Адкрыцці

# Месца прыцягнення творчай энергіі

**У Мазыры напярэдадні правядзення фестывалю працаўнікоў аграрнай галіны «Дажынкі-2020» шэраг сацыяльна значных аб'ектаў святкуе наваселлі. Так, у новым уласным будынку цяпер будзе працаваць Мазырскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі. Гэта сапраўдная тэрыторыя прыцягнення творчай энергіі Мазыршчыны.**



Доўгі час дзеці і педагогі праводзілі заняткі ў прыстасаваных памяшканнях. Месца было мала — каля 200 «квадратаў» для амаль тысячы дзяцей. Новы адрас прапіскі — будынак, у якім раней размяшчаўся раённы суд пасля маштабнай мадэрнізацыі. Праведзены капітальны рамонт даху і фасаду, умацаваны апорныя канструкцыі сцен, зроблены ўнутраны рамонт кабінетаў, санвузлоў, заменены вокны і дзверы. Акрамя таго, уладкаваны залы для выставак і для заняткаў па харэаграфіі, куток для адпачынку бацькоў.

На будаўніча-мантажныя работы было накіравана больш за 545 тысяч рублёў. На набыццё мэблі, абсталявання і інвентару вылучана больш як 83 тысячы рублёў. Жыхары Мазыра частку сродкаў сабралі на суботніку — 8 % ад агульнага кошту ўсіх выдаткаў.

На першым паверсе размясціўся гаспадарчы блок з гардэробам і касцюмернымі, на другім і трэцім — прастора для творчасці выхаванцаў, чацвёрты адведзены пад адміністрацыю.

У новым будынку ёсць дзе разгарнуцца ўдзельнікам ажно 73 аб'яднанняў па інтарэсах. Самыя папулярныя з іх — дэкаратыўна-прыкладное, вакальнае, харэаграфічнае, выяўленчае. Ацанілі новыя ўмовы і 60 педагогаў цэнтра разам з кіраўніком установы Аксанай Казачэнкай.

Між тым Мазырскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі складаецца з больш чым 1700 філіялаў. У гэтым навучальным годзе ў ім упершыню пачалі работу з дзецьмі, якія маюць псіхафізічныя асаблівасці. Створана таксама пастаянная экспазіцыя дзіцячай творчасці і відаў рамёстваў Палесся.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** павіншаваў педагогаў і дзяцей з наваселлем:

— Разглядзець талент у дзіцяці, раскрываць яго, падтрымліваць, калі яно сумняваецца, і ўпэўнена весці яго да майстэрства і заваявання новых вяршыняў — задача сумленнага творчага педагога. Доказам таму служаць 90 узнагарод рознай вартасці ў міжнародных, рэспубліканскіх і абласных конкурсах, якія дзеці заваявалі за мінулы навучальны год. На працягу некалькіх гадоў цэнтр застаецца адным з лідараў у сваім кірунку ў Гомельскай вобласці, — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна. — Упэўнены, пры такім высокім патэнцыяле і дзякуючы створаным камфортным умовам для работы і творчасці, юныя мазыране будуць і далей развіваць свае таленты, дасягаць новых вяршыняў, услаўляць рэгіён і краіну сваімі поспехамі.

На адкрыцці ўстановы губернатар падарыў цэнтру сертыфікат на 50 тысяч рублёў для далейшага развіцця і ўмацавання яго базы. Яшчэ адзін сертыфікат перадала ўстанове старшыня Мазырскага райвыканкама Алена Паўлечка.

Асвойваючыся ў новых кабінетах, выхаванцы цэнтра імкнуліся распавесці пра сваю дзейнасць і прадэманстраваць свае поспехі. Дарэчы, тут дзейнічаюць яшчэ і дзіцячыя і маладзёжныя арганізацыі: добраахвотніцкі атрад, інтэлектуальны клуб і аб'яднанне юных журналістаў.

Генадзь Салавей пры размове з прадстаўнікамі мясцовага маладзёжнага савета заўважае, што гэта арганізацыя — першая прыступка да ўдасканалення нашага жыцця:

— Тут вы набываеце навыкі ў тых кірунках, якія вам спатрэбяцца ў жыцці. Дадатковая адукацыя таксама дапаможа ў выбары жыццёвага шляху. Я хачу, каб ваш мазырскі досвед распаўсюджваўся. Нам важна ўлічваць вашы погляды на жыццё, на нашу работу — мы будзем прыслухоўвацца да вашай думкі. Вы можаце смела дзяліцца сваім пунктам гледжання з намі, прадстаўнікамі старэйшага пакалення. І будзьце ўпэўнены: мы вас пачуем.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 30 (518)

# ФІЛАРМОНІЯ ЗАПРАШАЕ НА СВЯТА

**У Міжнародны дзень музыкі Беларуская дзяржаўная філармонія адкрывае 83-і сезон. У гала-канцэрце прымуць удзел вядучыя акадэмічныя калектывы і салісты. Публіку чакаюць беларускія прэм'еры і выкананне сусветна вядомых твораў класічнай музыкі.**

Доўгачаканае адкрыццё сезона 2020—2021 выпала на няпросты перыяд, калі пандэмія ўносіць свае абмежаванні і карэкціроўкі. Працяглы перапынак і адмена многіх канцэртаў сталі вымушанай мерай, але паціху Беларуская дзяржаўная філармонія вяртаецца да актыўнай дзейнасці. Кіраўнікі калектываў запланавалі на гэты дзень некалькі гучных прэм'ер.

Так, у першым аддзяленні слухачоў гала-канцэрта чакае выступленне Дзяржаўнага камернага аркестра пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора — заслужанага артыста Расіі Яўгена Бушкова.

Партнёрам аркестра стане Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Беларусі Наталлі Міхайлавай. Упершыню прагучаць арыгінальныя «Варыяцыі» бельгійскага карыфея скрыпічнай музыкі Эжэна Ізаі — сачыненне на знакамітую тэму 24-га капрыса Нікало Паганіні. Галоўным акцэнтам аддзялення стане прэм'ернае для Беларусі выкананне маштабнага твора аргенцінскага кампазітара Марціна Пальмеры «Магніфікат». І, безумоўна, аркестр адзначыць 180-годдзе Пятра Ільіча Чайкоўскага, а менавіта прэм'ерай аранжыроўкі «Калыханкі» ў апрацоўцы Сяргея Рахманінава, зробленай галоўным дырыжорам аркестра Яўгенам Бушковым.

У другім аддзяленні сваю праграму прадставяць Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора — народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава. Выбіраючы творы для праграмы, маэстра імкнуўся паказаць майстэрства калектыву і яго вядучых музыкантаў-салістаў, а таксама разнастайнасць жанраў. Пачуем «Сімфонію псалмоў» Ігара Стравінскага, творы Станіслава Манюшкі, сімфанічную фантазію Золтана Кодаі і многія іншыя творы.

Увогуле канцэрт адкрыцця аб'яднае чатыры калектывы і 11 салістаў. Упершыню сезон адкрые прывітальным словам кіраўнік філармоніі Аляксандр Нікіта. Установа чакае сустрэчы са сваімі слухачамі 1 кастрычніка ў 19.00.

**Алена ДРАПКО.**

# КАЛЯРОВАЕ ПАДАРОЖЖА

**Відавочна, што пакуль былі зачыненыя музеі, гледачы засумавалі па «жывой» сустрэчы з карцінамі. Бо прызнаемся шчыра — ніякія віртуальныя прэзентацыі (дарэчы, дзякуй за іх нашым музеям) не заменяць сузірання ўсёй непаўторнасці адценняў і фактур шэдэўра, маўклівай размовы з мастаком. І няхай трывога застаецца, але ўсё часцей людзі прыходзяць у свой любімы музей — ратавацца гутаркай з вечным, з беларускім. Ну а супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея заўжды гатовыя прапанаваць нам усё самае цікавае і крэатыўнае. Я з вялікай радасцю зноў прыйшла ў наш галоўны мастацкі музей, дзе не была ўжо даўно. І адразу выбудаваліся некалькі маршрутаў праз неверагодны сусвет фарбаў, ліній, адценняў і формаў.**



## Маршрут першы.
## ЛЕГЕНДА

Падарожжа пачалося, так бы мовіць, «пад знакам» легендарнага беларускага мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Якраз адбылася прэзентацыя новай кнігі пра яго, аўтарства **дырэктара музея, вядомага мастака і мастацтвазнаўцы Уладзіміра ПРАКАПЦОВА *(на фота)***. Уладзімір Іванавіч шмат пісаў пра Бірулю, даследаваў яго творчасць і біяграфію. Выданні з рэпрадукцыямі славутых мастакоў — гэта, напэўна, найлепшы сродак папулярызацыі нацыянальнай культуры. І падчас той прэзентацыі Уладзімір Іванавіч падзяліўся новай цікавай задумай: у музея з выдавецтвам «Беларусь» маецца амбіцыйны план — выдаць трынаццаць тамоў, у якіх «сабраць» усе шэдэўры Нацыянальнага мастацкага музея.

А яшчэ наведвальнікі змогуць нейкі час палюбавацца нацюрмортам Марыі Ісаёнак «Сонечны дзень. Прысвячэнне Бірулю» і пейзажам Мікалая Ісаёнка «Жнівень. Поле Бірулі. На радзіме Бірулі». «Нейкі час» — таму што палотнам наканавана адправіцца ў Магілёў, у экспазіцыю музея Бялыніцкага-Бірулі. Карціны вядомай мастакоўскай пары падчас прэзентацыі музею перадала Марыя Ісаёнак.

## Маршрут другі.
## ДЛЯ ЮНЫХ

Наш наступны маршрут пачынаўся пад лічылку «Раз, два, тры, чатыры, пяць, я іду цябе шукаць». Ілюстрацыі да кніг для дзяцей і падлеткаў, зробленыя майстрамі XX—XXI стагоддзяў, стракацеюць усімі фарбамі, прымушаюць усміхацца, а яшчэ — адразу пазнаць непаўторны стыль аўтара. Толькі азірнешся, успомніш імёны: Аксана Аракчэева, Кацярына Дубовік, Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі, Валерый Славук, Васіль Шаранговіч, Барыс Забораў, Павел Татарнікаў... Як бачыце, ад народных мастакоў да сённяшніх маладых-таленавітых.

— Звярніце ўвагу: карціны вісяць ніжэй. Гэта для таго, каб іх маглі разгледзець нават самыя маленькія гледачы, якія прыйдуць на выстаўку, — расказвае **Святлана АНЭЙКА, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і асветніцкай працы.** — Яшчэ адна фішка: частка работ — у аўтарскіх паспарту. Паглядзіце: гэта могуць быць абрысы матылька ці кветкі. Да выстаўкі падрыхтаваныя закладкі на падставе прадстаўленых прац, іх атрымалі першыя з тых, хто прыйшоў на выстаўку. За першы ж дзень раздалі сто пяцьдзясят! Падрыхтавалі і паштоўкі, іх таксама раздаздзім падчас мерапрыемстваў, у якіх возьмуць удзел вядомыя артысты. Таксама будзе квэст для маленькіх і дарослых, які дапаможа ўспомніць вядомыя казачныя сюжэты. Для юных наведвальнікаў маецца расфарбоўкі і пясочніца з фігуркамі жывёл. Так што маладым бацькам з дзецьмі будзе і прыемна, і зручна правесці з намі час.



Міхась СЯЎРУК. Слуцкая брама.

## Маршрут трэці.
## ГЕРАІЧНЫ

Яшчэ адна новая выстаўка ў музеі — да 75-годдзя Перамогі. Ваенная тэма ў беларускім мастацтве зрабілася ці не адной з галоўных. Бо, як распавядаюць мастацтвазнаўцы, яе распрацоўваюць ужо як мінімум тры пакаленні мастакоў: відавочцы — тыя, хто нарадзіўся ў 1930-х, прадстаўнікі пакалення «дзяцей вайны» і нашы сучаснікі, што асэнсоўваюць трагічныя падзеі з адлегласці, праз чужы вопыт.

— Тут прадстаўлены працы буйных мастакоў з фондаў нашага музея. Працы ў асноўным манументальныя — гэта і тэндэнцыя беларускага жывапісу другой палавіны XX стагоддзя, і маштаб сюжэтаў патрабуе пэўнага фармату, — тлумачыць Святлана Анэйка.

## Маршрут чацвёрты.
## НЯМЕЦКІ

Калі чытаеш архіўныя матэрыялы 1920—1930-х гадоў, можаш толькі горка шкадаваць, трапляючы на звесткі аб тым, колькі тады было вывезена прадметаў сусветнага мастацтва з Беларусі ў іншыя музеі. Вялізныя страты культурнай спадчыны адбыліся і падчас вайны. Але сёння ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея дастаткова твораў сусветнага мастацтва, якія збіраліся руплівымі супрацоўнікамі, набываліся ў прыватных калекцыянераў, прымаліся ў дар. Сёння ў асобнай экспазіцыі можна пабачыць нямецкі жывапіс і гравюру XVII—XVIII стагоддзяў з музейных фондаў. Адкрыйце для сябе незвычайныя культурныя паралелі. Вось, напрыклад, парадны партрэт у нямецкім стылі вялікага гетмана Міхала Казіміра Агінскага, які ператварыў Слонім у «прыстанак муз». Аўтар урачыстай карціны — насамрэч аўтарка, мастачка Ганна Разіна Лішэўская, дачка вядомага мастака польскага паходжання. Яна намалявала князя ў 1754 годзе, калі той прыехаў у Нямеччыну на ўзнагароджанне ордэнам Белага Арла. А вучань Дрэздэнскай школы Фрыдрых Барызьен намаляваў партрэт уладальніка маёнтка Раманава на Аршаншчыне Аляксея Дандукова. Расеец Дандукоў, нашчадак калмыцкага хана, атрымаў ва ўладанне на беларускіх землях маёнтак, канфіскаваны ў Караля Радзівіла, калі той адмовіўся прысягнуць на вернасць Кацярыне II. Так што перад вамі — магчымасць не толькі пазнаёміцца з нямецкім мастацтвам, але і заглыбіцца ў таямніцы беларускай гісторыі.

## Маршрут пяты.
## КРАЯЗНАЎЧЫ

Незвычайна цёплае і адначасова шчымлівае ўражанне... Карціны мастакоў, якія занатоўваюць так званую «малую радзіму». Але недарэмна выстаўка называецца «Малая радзіма — вялікая зямля».

Грамыка, Цвірка, Шчамялёў, Маркавец, Сяўрук, Кірэеў, Кожух, Данцыг...

Каложская царква, Заслаўе, Слуцкая брама ў Нясвіжы, Блакітныя азёры...

Непаўторныя стылі, непаўторныя выявы... Для майстроў мілыя сэрцу краявіды — падстава для філасофскага выказвання. Таму зубры ператвараюцца ў магутнае ўвасабленне стыхіі, квітнеючы луг выяўляе абрысы жаночай фігуры, стагі нагадваюць анёлаў... Праўда, як ні дзіўна, ніводнай аўтаркі-мастачкі тут не прадстаўлена.

Мастацтвазнаўца Надзея Вусава звяртае нашу ўвагу на карціны так званай «заводскай урбаністыкі»:

— Калісьці яны ўспрымаліся як кан'юнктурныя — заводы, вытворчасць, працоўны люд вяртаецца са змены... Але сёння выглядаюць зусім па-іншаму. Сёння такімі карцінамі захапляюцца. Паглядзіце хоць бы на палатно Івана Стасевіча, на якім намаляваныя шахцёры Салігорска — якая экспрэсія, якія твары! Гэта канкрэтныя людзі, іх мастак пісаў з натуры. Цікава было б даведацца, як склаўся лёс кожнага.

Не ведаю, якія і калі ў вас, шаноўныя чытачы, адбудуцца спатканні ўжывую з карцінамі — але пры магчымасці не праміньце іх.



**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ДОМ ПАД ТАПОЛЯЙ ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ

## 75 гадоў таму адкрылася першая экспазіцыя музея Янкі Купалы

**20 верасня 1945 года першыя наведвальнікі прыйшлі ў музей Янкі Купалы, дырэктарам якога стала Уладзіслава Францаўна Луцэвіч — жонка народнага паэта, якая прысвяціла жыццё захаванню яго памяці. Тая экспазіцыя знаходзілася ў былым Доме прафсаюзаў. А ў 1959-м на месцы знішчанага падчас вайны дома паэта паўстаў той будынак, у якім Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы знаходзіцца і цяпер. Змяняліся часы, змяняліся месцы, змянялася экспазіцыя... Але зноў і зноў вяртае да сябе дом, дзе гучыць камертон беларускай нацыі, жыве яе дух. Давайце з нагоды пачэснага юбілею пройдземся па залах музея, у кожнай з якіх свае цікавосткі. Экскурсію па найбольш адметных экспанатах, якія нельга прамінуць, для нас правядзе вучоны сакратар музея Галіна ВАРОНАВА.**

### Макет дома, у якім нарадзіўся Янка Купала

Перад намі выгляд дома ў Вязынцы на той момант, калі ў ім адкрыўся філіял музея. Сучасны яго выгляд адрозніваецца ад гэтага макета.



— Справа ў тым, што ў 1970-я да 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, калі стваравўся Купалаўскі мемарыяльны запаведнік, гэты дом рэканструявалі і вярнулі яму той выгляд, які ён меў на 1882 год. Так знікла невялічкая прыбудова, трысцен, якая з'явілася пасля таго, як Луцэвічы з'ехалі з арэнды ў Вязынцы.

### Цымбалы

Гэты прадмет, па сцвярджэнні Галіны Юр'еўны, заўсёды прыцягвае ўвагу наведвальнікаў.

— Добра вядома, што музыку ў сям'і Луцэвічаў любілі. Маці паэта была выдатнай спявачкай, яе нават празвалі «Бянігна-пявуння». І бацька, Дамінік Ануфрыевіч, як прыходзілі ў фальварак вандроўныя музыкі, заўсёды запрашаў тых у хату, каб ладзілі канцэрты для дзяцей. Ды і сам Янка, паводле ўспамінаў блізкіх, іграў на двух музычных інструментах — на дудачцы і на скрыпцы. Невыпадкова свой першы паэтычны зборнік ён назваў «Жалейка».



На цымбалах, якія можна пабачыць у экспазіцыі, Янка сам не іграў. Але яны былі знойдзеныя ў ваколіцах Вязынкі, радзімы песняра, і па ўзросце — равеснікі з паэтам. А дзякуючы сучасным мультымедыйным тэхналогіям у музеі вы пачуеце запіс вясельнага марша, выкананага на цымбалах.

### Акно кватэры Эпімаха-Шыпілы

На жаль, меморый, прадметаў, якія помняць Янку Купалу, захавалася не так шмат. Дом паэта быў разбураны, вывезці ў эвакуацыю мала што змаглі. Але ў трэцяй зале якраз можна пабачыць адзін з прадметаў, што памятае песняра. І гэта... акно.



— У 1909—1913 гадах Янка Купала жыў і вучыўся ў Санкт-Пецярбургу. Ён кватараваў у прафесара Браніслава Ігнатавіча Эпімаха-Шыпілы, які быў для яго і апекуном, і добрым сябрам, і першым рэдактарам. У экспазіцыі ўзноўлена частка інтэр'ера пакоя, у якім жыў Купала. Рэканструкцыю зрабілі паводле здымка. Адметнасць ансамбля — аўтэнтычнае акно з дома № 45 на 4-й лініі Васільеўскага вострава, якое перавезлі ў наш музей ужо ў 1970-я гады, уманціравалі, і яно стала своеасаблівым акном у часе.

### Падсвечнік у выглядзе сфінкса

Яшчэ адзін рарытэт — металічны падсвечнік у выглядзе сфінкса. Ён з дома маці паэта Бянігны Іванаўны ў фальварку Акопы, што на Лагойшчыне.



— У гэтыя прыгожыя мясціны Купала прыязджаў амаль штогод, недзе з 1910 па 1926-ы. У Акопах раскрыўся яго талент лірыка і драматурга. Можна ўявіць, што якраз пасля вандровак па маляўнічых ваколіцах, пры свечцы ў гэтым падсвечніку і нараджаліся шэдэўры. Прадмет унікальны яшчэ і тым, што матэрыяльных успамінаў пра Акопы захавалася мала, бо ў 1930 годзе сваякі Янкі Купалы, што жылі на гэтым хутары, а гэта сям'я яго малодшай сястры Леакадзіі — сама Лёля, яе муж Юльян Раманоўскі, дзеці — трапілі пад раскулачванне і вымушаныя былі пакінуць свой дом назаўсёды.

### Рукапіс зборніка «Шляхам жыцця»

Старыя рукапісы — гэта, вядома, такія далікатныя артэфакты, якія не кожнаму даюць пагартаць. Але ў музеі кожны можа пагартаць рукапіс Купалы з дапамогай электроннай прылады.



— Рукапіс зборніка «Шляхам жыцця» — вялізны сшытак, які паэт перадаў у выдавецкую суполку «Загляне сонца і ў наша ваконца». Гэты зборнік лічыцца адной з вяршынь беларускай лірычнай паэзіі.

### Тэатральны макет Аскара Марыкса

У зале, прысвечанай тэатральнаму мастацтву, канешне, вочы разбягаюцца... Сцэны са спектакляў, афішы, касцюмы, фотаздымкі, макеты...

— На маю думку, самы цікавы з макетаў — той, што створаны Аскарам Марыксам, ён узнаўляе другую дзею пастаноўкі драмы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» на сцэне Першага беларускага дзяржаўнага тэатра. Янка Купала падчас працы над спектаклем даваў Марыксу парады наконт афармлення, і мастак іх выкарыстоўваў.



Аскара Марыкса, славака па паходжанні, называюць «бацькам беларускай сцэнаграфіі». Сярод іншага ён навучыў беларускіх тэатральных мастакоў метаду трохмернага тэатральнага макета, і сёння гэта распаўсюджаная практыка. Макет, на жаль, не 1920-х гадоў, ён узноўлены для музея ў 1947 годзе па просьбе першага дырэктара, Уладзіславы Францаўны Луцэвіч.

### Філіжанка, сподак і лыжачка

Асобная зала апавядае пра мінскае жыццё Янкі Купалы. Самае каштоўнае ў гэтай экспазіцыі, на думку Галіны Юр'еўны, — тры, здавалася б, самыя звычайныя, някідкія прадметы: крохкая філіжанка для кавы, сподак і чайная лыжачка.



— Гэта прадметы з дома Янкі Купалы на вуліцы Кастрычніцкай, якія ацалелі, нягледзячы на бамбёжку, што знішчыла «дом пад таполяй». Яны былі знойдзеныя падчас будаўніцтва сучаснага музея. Уладзіслава Францаўна Луцэвіч пазнала рэчы са свайго дома. Дарэчы, у нашых наведвальнікаў ёсць шанец пабачыць самім, як паэт п'е гарбату: у экспазіцыі, што ўзнаўляе інтэр'ер яго кабінета, з дапамогай сучасных тэхналогій з'яўляецца «прывід» Янкі Купалы і гучыць запіс яго голасу.

### Кампазіцыя «Шлях паэта»

Вядома, нельга абмінуць інсталяцыю, створаную мастакамі Паўлам Вайніцкім і Аленай Златкавіч. Яна прысвечана таямніцы трагічнай смерці Янкі Купалы, які загінуў у 1942 годзе ў лесвічным пралёце гатэля «Масква». Своеасаблівы вір са шкла і сталі... Стары гадзіннік, на якім стрэлкі назаўсёды спыніліся на палове адзінаццатай вечара — часе смерці паэта. Тэлефон са знятай слухаўкай — згадвалі, што Купала пакінуў нумар Міхася Лынькова пасля тэлефоннай размовы.



— Тут прысутнічаюць унікальныя меморыі. Прыступкі ракавога лесвічнага пралёта, у якім загінуў Янка Купала. Фрагменты інтэр'ера нумара 414, у якім ён правёў апошнія дні свайго жыцця. Гэтыя ўнікальныя прадметы трапілі ў музей ужо ў XXI стагоддзі, калі ў 2004-м было прынята рашэнне аб зносе гатэля «Масква». Супрацоўнікі музея і беларускія дыпламаты вывезлі гэтыя экспанаты — па сутнасці, адзіныя сведкі трагедыі. Яны не маюць свайго голасу, але зноў і зноў нагадваюць нам пра тую горкую трагедыю.

* * *

Абавязкова наведайце дом песняра... Тым больш, акрамя стацыянарнай экспазіцыі, там цяпер дзейнічаюць надзвычай цікавыя выстаўкі. «Мой кліч вечавы» — да 90-годдзя скульптара Льва Гумілеўскага, які з'яўляецца адным з аўтараў помніка Янку Купалу ў Мінску, а ў творчым тандэме з сынам Сяргеем стварыў помнік паэту ў Маскве. Сярод артэфактаў можна пабачыць і макет помніка Купалу і Коласу «Звон», які меркавалася паставіць у Варшаве: паэты б'юць у набат. Яшчэ адна часовая выстаўка прысвечана творчасці народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. У мінулым годзе музей набыў сямнаццаць яго графічных прац, прысвечаных Янку Купалу.

А ў фае музея знаходзіцца яшчэ адна незвычайная выстаўка — «Вяртанне з папялішча», якую можна наведаць да канца верасня. Калі нядаўна ў парку Янкі Купалы праводзіліся земляныя работы, навуковы супрацоўнік музея Павел Каралёў знайшоў шмат артэфактаў з жыцця даваеннага Мінска. Рэшткі кафлі, посуду, прадметы побыту... Музей чакае вас з панядзелка да суботы з 10.00 да 17.00.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# «Праз інтэрв'ю газеце мы можам раскрыць свой спорт»



**Ігнат ГАЛАВАЦЮК — чэмпіён свету сярод студэнтаў, чэмпіён свету сярод юніёраў, чэмпіён Беларусі, неаднаразовы прызёр этапаў Кубка свету па канькабежным спорце. Найлепшы канькабежац краіны.**

— Мне, як маладому спартсмену, падабаецца, што «Звязда» не абыходзіць увагай маіх калег і моладзь. На старонках газеты можна заўсёды знайсці пазнаёміцца з цікавымі людзьмі і адкрыць для сябе штосьці новае. Мы, спартсмены, стараемся паказваць добры вынік не дзеля таго, каб пра нас напісалі ў газетах, але заўсёды прыемна, калі цікавяцца тваёй дзейнасцю. Праз інтэрв'ю ў такой адметнай газеце, як «Звязда», мы можам раскрыць свой спорт, паказаць, якое цяжкае, але незвычайна разнабаковае спартыўнае жыццё. Так мы папулярызуем свой спорт, у маім выпадку — канькабежны, і здаровы спосаб жыцця. Вельмі спадзяюся, што хоць адзін чытач «Звязды» ўзяў прыклад са спартсменаў і пачаў весці здаровы спосаб жыцця. Тады наша супрацоўніцтва з журналістамі можна лічыць удалым.

Я хацеў бы параіць усім чытаць «Звязду» хоць бы дзеля прыгожай беларускай мовы. Мы не заўсёды карыстаемся ёй у паўсядзённым жыцці, але забываць яе нельга. Я хачу пажадаць газеце больш нестандартных і актуальных тэм для матэрыялаў, такіх жа цікавых герояў, як спартсмены, і адданых чытачоў.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Другая эканоміка Еўропы рэкордна завінавацілася



Дзярждоўг Францыі дасягнуў рэкорднага высокага ўзроўню ў 114,1 працэнта ад ВУП, паведаміў Нацыянальны інстытут статыстыкі і эканамічных даследаванняў (Insee). Гэта на 12,7 пункта вышэй, чым у мінулым квартале. Францыя сутыкнулася з самым буйным павелічэннем дзяржаўнай запазычанасці за ўвесь перыяд вядзення статыстыкі з 1995 года. У грашовым выражэнні доўг другой эканомікі Еўропы дасягнуў 2,6 трыльёна еўра. Выдаткі былі звязаны з фінансаваннем мер, якія прымаюцца ва ўмовах крызісу, выкліканага пандэміяй каранавіруса. Напрыклад, улады накіравалі сродкі на праграму выплат дапамог па тэхнічным беспрацоўі. У канцы 2019 года дзярждоўг Францыі знаходзіўся на адзнацы 98,1 працэнта ВУП. Эканоміка краіны скарацілася на 13,8 працэнтных пункта сёлета ў другім квартале ў параўнанні з першым, што стала рэкордным спадам за 70 гадоў. У першым квартале Францыя перажыла падзенне ў 5,9 працэнта.

## Суд Ганконга прысудзіў школьніка да 40 месяцаў турмы за ўдзел у беспарадках

Суд у Ганконгу прысудзіў 17-гадовага школьніка да трох гадоў і чатырох месяцаў турмы за ўдзел у масавых беспарадках у ліпені мінулага года. Пра гэта паведаміла газета The Standard. Падлетак, якому на той момант было 16 гадоў, прызнаны вінаватым ва ўдзеле ў збіцці двух паліцэйскіх. Іх акружыла група антыўрадавых дэманстрантаў у гандлёвым цэнтры і атакавала парасонамі. Двое іншых удзельнікаў напады ва ўзросце 24 гадоў і 51 года атрымалі па чатыры гады турмы. У чэрвені мінулага года ў Ганконгу пачаліся масавыя хваляванні з-за намеру мясцовых улад прыняць законапраект аб экстрадыцыі, які дазваляе выдаваць правапарушальнікаў мацерыковаму Кітаю. Нягледзячы на адкліканне гэтай заканадаўчай ініцыятывы, прыхільнікі апазіцыі працягвалі антыўрадавыя выступленні, якія доўжыліся да сярэдзіны лістапада і суправаджаліся блакаваннем дарог, гвалтам, падпаламі і актамі вандалізму. Усяго паліцыяй за год было затрымана звыш 9 тысяч парушальнікаў парадку. Сярод іх шмат школьнікаў і студэнтаў.

## Карнавал у Рыа адклалі з-за каранавіруса

Знакаміты карнавал у Рыа-дэ-Жанэйра не будзе праведзены ў звычайны час у лютым 2021-га з-за пандэміі COVID-19. Аб гэтым паведаміла бразільская тэлерадыёкампанія Globo са спасылкай на арганізатара — Незалежную лігу школ самбы. «Гаворка ідзе не аб адмене, але аб пераносе свята і пошуку рашэння. Арганізаваць выступленні ў лютым не ўяўляецца магчымым. Мы шукаем альтэрнатыву», — пракаментаваў рашэнне прэзідэнт лігі Жоржы Каштанейра. У ліпені кіраўнікі школ самбы ўжо прыйшлі да пагаднення адносна таго, што выступленні можна будзе арганізаваць толькі пры наяўнасці вакцыны.


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| |
|---|
| ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 431/С-35939 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина с стеклоприемным пунктом), общей площадью 100,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5 |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001001622, площадью 0,0354 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 5.1, площадью 0,0007 га |
| Начальная цена продажи – 16 186,84 руб. (шестнадцать тысяч сто восемьдесят шесть рублей восемьдесят четыре копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 1 618 руб. (одна тысяча шестьсот восемнадцать рублей) |
| **Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Кореличский филиал), 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, 8-01596-2-14-84** |
| **Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70** |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 26 октября 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/ Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.01.2020 г. |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)** |
| **Последний день приема заявлений – 22 октября 2020 г. до 15.00** |

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**



• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** | |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** | |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б** | |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** | |
| **Предмет электронных торгов Капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114** | | |
| **Наименование (назначение)** | **Инв. номер** | **Общ. площадь** |
| **Гаражи на 4 автомашины** (здание нежилое) | 102/С-9461 | 89,3 кв. м |

**Сведения о земельных участках:** пл. 0,0245 га, предоставлен на праве аренды сроком по 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины

**Начальная цена (с НДС 20 %): 8 520,00 белорусских рублей**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 08.00 до 17.00, +375 (33) 673 28 47 (Мизюк Наталья Леонтьевна)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 (двадцать) рабочих дней** после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 10.00 27.10.2020 г. Окончание торгов: 12.00 27.10.2020 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.10.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |



Признать недействительными страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь формы ОГО серии НА №№ 1530870, 1637004 в количестве 2 шт. представительства Белгосстраха по Червенскому району.

УНП 100122726



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

# ОАО «Брестобувьторг»

**Предмет торгов – Лот:** изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-64569 (наименование: проходной пункт; назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду), площадью 25,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 100

| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 7 834,00 | **Размер задатка, руб.** | 783,40 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Брестобувьторг», 224020, г. Брест, ул. Янки Купалы, 100. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 календарных дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона

**Аукцион состоится 27 октября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 26 октября 2020 г. до 17.00**



# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Спецмонтажстрой» № 177 г. Гомель»** (УНП 400063524) 246027, г. Гомель, ул. Барыкина, 323 в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая Стратегия», тел. +375 (17) 396-61-34.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **27 октября 2020 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ 33021, 1998 г. в. | 2 300,00 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ 33023, 2004 г. в. | 2 700,00 |
| 3 | Автомобиль ЗИЛ-131, 1990 г. в. | 5 300,00 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 5551, 1998 г. в. | 4 500,00 |
| 5 | Автокран МАЗ 5337-КС 3577-4, 1991 г. в. | 7 900,00 |
| 6 | Полуприцеп ОДАЗ 9370, 1190 г. в. | 2 100,00 |
| 7 | Полуприцеп МАЗ 5247Д, 1983 г. в. | 12 100,00 |
| 8 | Полуприцеп ПЭ 1407 | 4 500,00 |
| 9 | Автобус ГАЗ 32213, 2008 г. в. | 1 200,00 |
| 10 | Экскаватор ЭО-5111Б, 1989 г. в. | 19 700,00 |
| 11 | Бульдозер ДЗ-171 на базе трактора Т-170, 1991 г. в. | 13 600,00 |
| 12 | Машина землеройная МЗЦ-75 на базе трактора ДТ-75, 1988 г. в. | 11 900,00 |
| 13 | Трубоукладчик ТГ-124А | 7 900,00 |
| 14 | Трубоукладчик ПТМ-3, 1981 г. в. | 5 000,00 |
| 15 | Трубоукладчик ПТМ-3, 2003 г. в. | 10 700,00 |
| 16 | Прицеп ПСЕ-Ф-12, 5Б, 1992 г. в. | 2 000,00 |
| 17 | Каток ДУ-54 | 3 100,00 |

**Местонахождение – г. Гомель, ул. Барыкина, 323.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 28.09.2020 г. 09.00 по 26.10.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.



# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «ПРОМИНВЕСТ»** (УНП 100646457) в лице антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп», тел. +375 (17) 396-61-34.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **27 октября 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой бортовой тентовый ЗИЛ-5301 АО, 1999 г.в. | 1 640,00 |
| 2 | Автомобиль грузовой вагон ГАЗ-2705, 1998 г.в. | 870,00 |

**Местонахождение – г. Минск, пр-т Дзержинского, 1Б.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 165-06-51 – Андрей Васильевич.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 28.09.2020 г. 09.00 по 26.10.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

# КРОЎ І РУБІНЫ

## Чаму ліхаманіць Мазамбік?



**Апошнім часам у Мазамбіку вельмі неспакойна. Урадавыя сілы па-ранейшаму спрабуюць вярнуць порт Масімба-да-Прая. Буйны горад у правінцыі Кабу-Дэлгаду быў акупаваны атрадамі баевікоў, звязаных з афрыканскімі структурамі тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава», яшчэ ў сярэдзіне жніўня. А ў верасні джыхадысты нанеслі новы ўдар: захапілі два астравы ў Індыйскім акіяне — Мекунга і Ваміс — на поўначы Мазамбіка, паведаміў тэлеканал CGTN. Па словах мясцовых жыхароў, дзёрзкі рэйд адбыўся позна ўвечары. «Яны прыбылі на невялікіх рыбацкіх лодках. Вывелі людзей з дамоў, а затым падпалілі іх жыллё», — распавёў адзін з месцічаў, які па іроніі лёсу перад тым уцёк на востраў Мекунга з захопленага раней тымі ж баевікамі партовага горада Масімба-да-Прая. Улады зробяць усё магчымае для абароны сваіх грамадзян ад нападаў тэрарыстаў, заявіў прэзідэнт Мазамбіка Філіпэ Ньюсі. Пра тое паведаміла «Радыё Мазамбіка». Аднак ці ўдасца навесці парадак у гэтай паўночнаафрыканскай краіне?**

### ЗАПАСЫ НА ЎЗБЯРЭЖЖЫ

Апошнія 15 гадоў аб'ём валавога нацыянальнага прадукту Мазамбіка павялічваўся значнымі тэмпамі — у сярэднім на шэсць працэнтаў у год. Гэта адбывалася дзякуючы распрацоўцы багатых прыродных рэсурсаў — запасаў вугалю і тытану, а таксама таннай гідраэнергіі. Але беднасць і няроўнасць у краіне толькі ўзмацняліся, адзначае «Бі-бі-сі». Не дапамаглі і велізарныя радовішчы газу і рубінаў, адкрытыя ў правінцыі Кабу-Дэлгаду, што на ўзбярэжжы Індыйскага акіяна. Як лічаць асобныя эксперты, усе бонусы дасталіся верхавіне партыі ФРЭЛІМО (Frente de Libertação o de Moçambique — «Фронт вызвалення Мазамбіка»), якая непадзельна кіравала краінай з моманту здабыцця незалежнасці ад Партугаліі ў 1975 годзе і праводзіла аднапартыйную палітыку.

5 кастрычніка 2017 года група ўзброеных ісламістаў захапіла і два дні ўтрымлівала стратэгічны порт Масімба-да-Прая ўсяго ў 60 кіламетрах ад галоўнага цэнтра газаздабычы ў Пальме. Ён меў важнае значэнне для забеспячэння і развіцця газавага праекта. Пасля было ўстаноўлена, што баевікі — не прыезджыя, а мясцовыя жыхары. Дарэчы, пасля ісламісты захоплівалі Масімба-да-Прая яшчэ двойчы.

З 2017-га гвалт у гэтых мясцінах пачаў імкліва разрастацца. За тры гады сама меней 1500 чалавек былі забітыя і 250 тысяч вымушаны пакінуць свае дамы. Улады страцілі кантроль над трыма прыбярэжнымі раёнамі, адзначае «Бі-бі-сі». Беспрацоўе сярод моладзі і галеча сталі фактарамі, якія спрыялі развіццю радыкальнай ісламісцкай ідэалогіі. У правінцыі Кабу-Дэлгаду пашыраецца дзейнасць тэрарыстычных груповак. Гаворка ў першую чаргу ідзе аб рэгіянальных структурах «Аш-Шабаб», якія дзейнічаюць у кааліцыі з падраздзяленнем «Ісламскай дзяржавы» ISCAP (Цэнтральнаафрыканская правінцыя ІД). Лідары «Аш-Шабаб» і ISCAP ставяць агульную мэту — стварэнне на тэрыторыі Мазамбіка ісламісцкай дзяржавы.

### ТЭРАРЫСТЫ Ў ЛЕСЕ

Баевікі хаваюцца ў лясных гушчарах рэгіёна, адкуль ажыццяўляюць свае тэрарыстычныя рэйды. Падчас нападаў яны катуюць і забіваюць людзей, выкрадаюць жанчын і дзяцей, спальваюць хаты, знішчаюць пасевы. Групоўка складаецца пераважна з грамадзян Мазамбіка, але таксама ўключае танзанійцаў і самалійцаў. Яна выкарыстоўвае даходы ад крымінальнай дзейнасці для ўладкавання баз на тэрыторыі Танзаніі і Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, дзе баевікі праходзяць падрыхтоўку да вядзення партызанскай вайны. Урадавыя войскі правялі шэраг контртэрарыстычных аперацый, аднак не змаглі спыніць дзейнасць тэрарыстаў. Вялікая плошча рэгёна не дазваляе сілавікам кантраляваць сітуацыю.



У кастрычніку 2018 года пачаўся буйны судовы працэс над дзвюма сотнямі падазроных у прыналежнасці да радыкальных ісламістаў. Улады Мазамбіка заявілі пра сувязі мясцовых радыкалаў з сумна вядомымі самалійскімі тэрарыстамі.

Мусульмане складаюць 18 працэнтаў ад прыкладна 30-мільённага насельніцтва Мазамбіка, але Кабу-Дэлгаду — рэгіён пераважна мусульманскі. У апошнія гады ён сутыкнуўся з наплывам як радыкальных ісламістаў, так і хрысціянскіх місіянераў, звязаных з міжнароднымі гуманітарнымі арганізацыямі.

«Новыя імамы», якія атрымалі рэлігійную адукацыю за мяжой, засноўваюць мячэці і вучаць, што старыя прапаведнікі звязаны з ФРЭЛІМО і ўдзельнічаюць у карупцыі і што жыццё па шарыяту будзе справядлівае. У іх знаходзяцца сродкі, каб дапамагаць мясцовым жыхарам пачынаць свой бізнес.

Прэзідэнт Мазамбіка прызнаў, што іх прыцягальнасць для насельніцтва нельга недаацэньваць. Першыя ўзброеныя сутыкненні паміж паліцыяй і прыхільнікамі традыцыйнага ісламу разам з фундаменталістамі адбыліся ў 2015 годзе. Тады радыкалы пацярпелі паражэнне і затаіліся. Як высветлілася, часу яны не гублялі.

### ПРЫЦЯГАЛЬНЫЯ АКТЫВЫ

Па іроніі лёсу, ФРЭЛІМО пачаў узброеную барацьбу за незалежнасць ад Партугаліі ў тых жа краях. Першы бой адбыўся 25 верасня 1964 года ў 60 кіламетрах на захад ад Масімба-да-Прая. Вялікім аўтарытэтам у правінцыі Кабу-Дэлгаду да сёння карыстаюцца два ветэраны вайны за незалежнасць — Альберта Чыпандэ і Раймунд Пачынуапа. Кожнаму — 81 год, абодва ўваходзяць у найвышэйшы орган ФРЭЛІМО — Паліткамісію.

Зацвердзіўшыся ва ўладзе, кіраўніцтва «Фронта вызвалення Мазамбіка» абвясціла курс на сацыялізм, але ў 1992 годзе рэзка перакавалася ў рыначнікаў. Пабудаваны ФРЭЛІМО капіталізм моцна карумпаваны, піша «Бі-бі-сі». У ходзе хуткай прыватызацыі сотні прадпрыемстваў дасталіся партфункцыянерам і высокапастаўленым вайскоўцам. Кантракты, канцэсіі і крэдыты размяркоўваліся ценявым шляхам. Два вядомыя выкрывальнікі злоўжыванняў у пачатку нулявых былі забітыя.

Калі ў 2009-м паблізу Монтэпеза, што ў правінцыі Кабу-Дэлгаду, адкрылі адно з найбуйнейшых у свеце радовішчаў рубінаў, мясцовыя жыхары пачалі самастойна шукаць іх, і сёй-той паспеў разбагацець. Але праз год канцэсію на распрацоўку атрымаў Раймунд Пачынуапа ў партнёрстве з мясцовай «дачкой» брытанскай кампаніі Gemfields Group Ltd.

Дробных старацеляў папрасілі «адысці ўбок». У ходзе развіцця радовішча знеслі вёску. Мазамбіцкі філіял Gemfields заўважае, што дзейнічаў у поўнай адпаведнасці з мясцовымі законамі і пабудаваў для перасяленцаў 105 дамоў. Тым не менш, 273 чалавекі звярнуліся ў брытанскі суд. У парадку ўрэгулявання спрэчкі мацярынская кампанія выплаціла ім 7,5 мільёна долараў.

Праз год на шэльфе правінцыі Кабу-Дэлгаду былі выяўлены найбуйнейшыя на ўсходзе Афрыкі радовішчы газу. Паводле падлікаў, агульны аб'ём здабычы з ужо разведаных участкаў дасягае два трыльёны кубічных метраў. Шэраг вядучых сусветных энергетычных груп, уключаючы Total і Exxon Mobil, гатовыя да рэалізацыі найбуйнейшых праектаў на суму ў 60 мільярдаў долараў па здабычы і вытворчасці ў гэтай частцы краіны звадкаванага газу.

Адчужэнне зямлі прыняло яшчэ большы маштаб. Праваабарончая і экалагічная група Justica Ambiental сцвярджае, што прапанаваныя кампенсацыі не былі адэкватныя. Раней мясцовыя жыхары апрацоўвалі зямлю матыкамі і рыбачылі на невялічкіх лодках, але пасля адкрыцця газу засталіся зусім без працы.

Моладзь, якая скончыла школу і спадзявалася, што дзякуючы прыходу «цывілізацыі» зможа жыць лепш, чым бацькі, была расчараваная. Праца ў будаўніцтве і газаздабычы знайшлася толькі для 2,5 тысячы мазамбікцаў, і тое ў асноўным не ўраджэнцаў Кабу-Дэлгаду.

### ГАРАЧАЯ КРОПКА

Заходнія палітыкі і фінансавыя аналітыкі, якія раней патрабавалі ад урада Мазамбіка празрыстага кіравання і барацьбы з беднасцю, пасля адкрыцця газу пачалі рабіць упор на яго адкрытасці для замежных інвестыцый. У 2019 годзе ФРЭЛІМО толькі мякка падакаралі за парушэнні падчас чарговых выбараў, іранізуе «Бі-бі-сі».

Сёлета 17 ліпеня амерыканскія і брытанскія банкі ўхвалілі пазыку ў 14,9 мільёна долараў, якая пойдзе ў асноўным на закупку абсталявання ў ЗША і Вялікабрытаніі. Праўда, гэтыя амбіцыйныя планы цяпер пад пагрозай з-за джыхадысцкіх выступленняў. Першапачаткова, паводле ацэнак спецыялістаў, канфлікт быў чыста ўнутраны. Ключавую ролю ў навучанні і кіраўніцтве партызанамі адыгравалі людзі, якія папярэдне атрымалі падрыхтоўку ў радах мазамбікскіх арміі і паліцыі. Цяпер канфлікт інтэрнацыяналізуецца. Радыкалы, па наяўных дадзеных, прысягнулі на вернасць арганізацыі «Ісламская дзяржава» і бяруць урокі як ваеннай справы, так і рэлігіі ў замежных інструктараў.

Урад, са свайго боку, наняў паўднёваафрыканскіх верталётчыкаў і вядзе перагаворы з той жа ПАР, а таксама з Францыяй і ЗША аб ваеннай дапамозе, уключаючы марское патруляванне ўзбярэжжа, каб спыніць сувязі паўстанцаў з Блізкім Усходам. Падчас свайго візіту ў адміністрацыйную сталіцу правінцыі Кабу-Дэлгаду — горад Пемба, які размешчаны ў 200 кіламетрах на поўнач ад захопленага баевікамі порта Масімба-да-Прая, прэзідэнт Мазамбіка заявіў, што ўлады адновяць мір і стабільнасць у гэтай частцы краіны. «Урад Мазамбіка забяспечыць устойлівае развіццё энергетычнага комплексу ў Кабу-Дэлгаду, што адкрывае новыя шляхі для развіцця ўсёй краіны,— падкрэсліў Ньюсі. — Зараз працягваецца работа, у выніку якой Мазамбік стане важным гульцом на рынку нафты і газу ўжо з 2022 года».

Рост уплыву і актыўнасці «Ісламскай дзяржавы» ў Мазамбіку стаў важнай тэмай для абмеркавання сярод краін Супольнасці развіцця Поўдня Афрыкі (Southern African Development Community — SADC). Асабліва гэта пытанне актуальнае для ПАР — паўднёвага суседа Мазамбіка і найбуйнейшай эканамічнай і ваеннай дзяржавы рэгіёна. Зараз размяшчэнне вайсковых кантынгентаў дзяржаў SADC у Мазамбіку ўсё яшчэ знаходзіцца пад пытаннем, аднак верагоднасць гэтага значна вышэйшая, чым некалькі месяцаў таму. І ў выпадку такога развіцця падзей, адзначае riafan.ru, баявыя дзеянні ў Кабу-Дэлгаду стануць найбуйнейшым па колькасці задзейнічаных бакоў канфліктам на поўдні афрыканскага кантынента з моманту завяршэння грамадзянскай вайны ў Анголе. Так што Мазамбік становіцца «гарачай кропкай» сапраўды сусветнага маштабу.



**Захар БУРАК.**




# МАЛОДШЫ СЯРОД ВОЛАТАЎ — БРЭСЦКІ МАЗ



**Новы айчынны аўтамабіль пад брэндам «МАЗ — Брэстмаш» пачалі выпускаць на берагах Мухаўца. Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з дырэктарам прадпрыемства-вытворцы Васілём КАХОВІЧАМ.**

## Прадстаўляем суразмоўніка

Васіль Каховіч родам з Брэстчыны. Сярэднюю школу заканчваў у Мінску. Выпускнік наргаса. Пасля службы ў Савецкай Арміі быў на адказнай рабоце ў Нацыянальным банку, падчас якой меў прамое дачыненне да выпуску айчыннай грашовай адзінкі.

Далейшай прыступкай гэтай жыццёвай школы стала дыпламатычная служба ў беларускім пасольстве ў Кыргызстане — у рангу часовага паверанага ў справах Беларусі. Вярнуўся начальнікам галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічных сувязяў Мінпрама. Далей чакаў сапраўдны экзамен на пасадзе ў Саўміне — інспектарам па Брэсцкай вобласці, калі адказваў за эканамічны блок пытанняў.

Работа па разнастайных кірунках, у тым ліку і гаспадарчым, дала вялікі жыццёвы вопыт. Які асабліва спатрэбіўся пасля пераходу на МАЗ. Два з паловай гады таму кіраўніцтвам холдынга накіраваны дырэктарам на праблемнае ААТ «Брэстмаш».

Што за гэты час удалося? Разам з камандай змаглі стабілізаваць эканамічную сітуацыю, пагасіць запазычанасці і па выніках года маюць намер вывесці прадпрыемства з ліку стратных. Сфарміраваны касцяк калектыву, з якім разам пераадольваюцца складанасці, іх пакуль хапае. І з дапамогай кіраўніцтва холдынга вызначыліся з новым перспектыўным кірункам — зборкай і мадыфікацыяй базавых грузапасажырскіх мікрааўтобусаў з маркай МАЗа.

**— Васіль Васілевіч, як нарадзілася даволі арыгінальная ідэя новага аўтамабіля?**

— Ідэя стварэння спачатку вытворчасці па зборцы малатанажнай аўтатэхнікі з'явілася на «БЕЛАЎТАМАЗе» прыкладна ў 2015 годзе, і пачаліся пошукі партнёра для сумеснай работы ў гэтым кірунку. У выніку спыніліся на кітайскай дзяржаўнай кампаніі «Jac Motors». Вяліся таксама прапрацоўкі — як і дзе лепш стварыць такую вытворчасць. Было прынята рашэнне аб яе арганізацыі на пляцоўках «Брэстмаша». Мяне накіравалі з галаўнога прадпрыемства холдынга для вырашэння задачы ў красавіку 2018 года. На той час я працаваў на МАЗе спачатку намеснікам камерцыйнага дырэктара па рэалізацыі аўтатэхнікі ў краіны СНД, затым памочнікам генеральнага дырэктара — кіраўніком праекта па стварэнні прадпрыемства «МАЗ — Вейчай», з нуля курыраваў пачатак будаўніцтва завода ў «Вялікім камені».

Прыехалі сюды з Аляксандрам Бражуком, які быў прызначаны галоўным інжынерам «Брэстмаша», а да гэтага працаваў на МАЗе начальнікам цэха рэдуктараў. За сем месяцаў падрыхтавалі цэх пад новае абсталяванне, змантаравалі яго і ў снежні 2018 года метадам буйнавузлавой зборкі сабралі першы аўтамабіль па праекце Мінскага аўтамабільнага завода з камплектуючых кампаніі «Jac Motors». Кузаў спраектаваны яе італьянскім філіялам, а асобныя дэталі інтэр'ера — японскім. Прыгожы фургончык быў рэалізаваны адразу, яго купіла школа коннага спорту на вяслярным канале ў Брэсце. Ездзяць да гэтага часу і, што называецца, не нарадуюцца.


Канвеер зборкі аўтамабіляў.

Мы працягваем буйнавузлавую зборку базавай мадэлі МАЗа. Паступаюць гатовыя аўтамабільны мост, рухавік, падвеска, іншыя вузлы ў падсабраным выглядзе. Выпусцілі больш за 150 мікрааўтобусаў МАЗ-281040 (пасажырскі, 16 месцаў) і МАЗ-365022 (грузавы). У выпадку неабходнасці магутнасці завода дазваляюць нарасціць выпуск да 2 тысяч адзінак у год. Раней «Брэстмаш» не займаўся зборкай аўто (рабіў толькі камплектуючыя для МАЗа), а зараз яна становіцца адным з найважнейшых кірункаў нашай вытворчасці. Лічым — перспектыўным.


Перад адпраўкай заказчыку.

А апошняя навіна заключаецца ў тым, што намі наладжана мадыфікацыя гэтага базавага аўтамабіля, атрыманы першы мадыфікаваны «Брэстмашам» узор. У ходзе мадыфікацыі аўтамабіль зазнаў змены, якія істотна мяняюць яго функцыянальнасць. У тым ліку адбыліся змены ў салоне, у яго інтэр'еры. Гэта ўжо распрацоўка нашага завода, і новы ўзор аўтамабіля лічыцца ўласным прадуктам «Брэстмаша». Мадыфікаваны варыянт мы зарэгістравалі як новы беларускі аўтамабіль, бо падказаныя часам і практыкай удасканаленні, выкананыя намі з бласлаўлення і пад патранажам галаўнога офіса МАЗа, атрымаліся даволі сур'ёзныя.

Мы гэты прадукт узаконілі — атрымалі на яго сертыфікат бяспекі грамадзянскага транспартнага сродку, для чаго прайшлі выпрабаванні на палігоне Нацыянальнай акадэміі навук. А ў Гандлёва-прамысловай палаце атрымалі сертыфікат уласнай вытворчасці. Маем права наносіць на кузаве свой він нумар. Такім чынам, гэта паўнавартасны наш аўтамабіль.

**— Вы дапамагаеце МАЗу — выпускаеце базавую мадэль, а таксама пачалі праводзіць мадэрнізацыю часткі машын, у выніку якой базавая машына набывае новыя функцыі. А краіна атрымала новае аўто. Гучыць як бы проста — узялі і перарабілі. На самай справе гэта ж велізарная работа.**

— Работа сапраўды велізарная. Пад праект была выдзелена значная плошча — каля 6 тысяч квадратных метраў, на ёй знаходзілася больш за 180 адзінак разнастайнага вытворчага абсталявання — станкі з ЛПК, прэсавае, слясарнае і іншае абсталяванне. Усё трэба было дэманціраваць, прыгоднае да эксплуатацыі перанесці ў іншыя месцы. Зрабілі ўласнымі сіламі, атрымалася хутка і добра. Пасля чаго будаўнікі па чарцяжах праектнага ўпраўлення МАЗа прыступілі да будаўніча-мантажных работ. Ускрылі падлогу, дах, фасад і прывялі памяшканне ў парадак. Укамплектавалі яго новым абсталяваннем менавіта для буйнавузлавой зборкі. Зборшчыкаў стажыравалі на найлепшых прадпрыемствах галіны.




Умоўна зборачная лінія разбіта на некалькі асноўных пастоў. На пад'ёмніку машына камплектуецца асноўнымі вузламі, затым заліваюцца ўсе неабходныя тэхнічныя вадкасці, машына ажывае — заводзіцца і пераязджае на лінію дыягностыкі. Пачынаюцца рэгуліроўкі. Затым праводзяцца хадавыя выпрабаванні.

Гатовы прадукт прымае спачатку АТК завода, затым спецыялісты ўпраўлення інспекцыйнага кантролю якасці ААТ «МАЗ». Пасля дасканалай праверкі складаюцца пратаколы прыёма-здатачных выпрабаванняў. Так што якасць мы гарантуем.

**— Васіль Васілевіч, чаму менавіта фургоны?**

— Рынкавы попыт на пасажырскія мікрааўтобусы пастаянны, як і на транспарт для аператыўных перавозак невялікіх па аб'ёме грузаў. Значыць, патрэбен фургон на грузавым шасі. Выпускаем два ў адным — пасажырскі варыянт і грузавы. Іх актуальнасць пацвярджае і наш асабісты вопыт — усе базавыя машыны рэалізаваны галоўным чынам у Беларусі, хоць былі і пастаўкі ў Расію, Казахстан, ва Украіну. А крайняя партыя базавых мадэляў закантрактавана поўнасцю. І чакаем у канцы верасня прыход яшчэ недзе ста камплектаў. Радуе, што заказы на выраб машын паступаюць не толькі ад арганізацый, але і міністэрстваў. Добрая слава пайшла.

**— На рынку існуе значная канкурэнцыя. Можна назваць цэлы шэраг вытворцаў...**

— Усё гэта так, але базавая камплектацыя, у якой мы збіраем мазаўскія бусы, намнога багацейшая, чым мадэлі тых канкурэнтаў, якіх вы можаце назваць. Па-першае, экалагічны клас — пяты, а не чацверты. Шасціступеньчатая каробка перадач, а не пяціступеньчатая. Двухузроўневы кандыцыянер — для кіроўцы асобна, у салоне асобна. Салон абсталяваны шторкамі, ёсць ступенька, якая выходзіць вам насустрач, калі дзверцы адчыняюцца... Раней частка з гэтага была дадатковай опцыяй, а зараз стала базавай камплектацыяй.

Індывідуальны кірунак абдзімання для кожнага пасажыра, як у самалёце. Рухавік — 2,7, дызель, надзвычай эканамічны, адпавядае экалагічнаму стандарту Еўра-5. Удалая падвеска.


Начальнік канструктарска-тэхналагічнага бюро Галіна ЮДЧЫЦ і галоўны інжынер Аляксей БРАЖУК.

Нашы выпрабавальнікі, што праводзяць абкатку пасля зборкі, а яны высокія прафесіяналы, сцвярджаюць, што машына вельмі надзейная ў эксплуатацыі ва ўсіх адносінах. Пачынаючы з таго, што надзейная сістэма тармазоў, ды і іншыя функцыі не падвядуць. Правяралі яе на ўсіх відах паверхняў, пускалі юзам — надзвычай устойлівая. Я магу доўга яе хваліць, і ўсё будзе праўда.

Так што мазаўская мадэль не ўступае, напрыклад, расійскім узорам па характарыстыках, а па інтэр'еры і экстэр'еры — заходнім. І ў той жа час больш танная, чым заходнія. Калі пагартаць свежыя параўнальныя характарыстыкі грузапасажырскіх мікрааўтобусаў на рынку, то бачым, што наш цэнавы варыянт самы, бадай, выйгрышны. І аўто лепш прыстасаванае для невялікіх грузаў, што важна на практыцы.

**— Раскажыце крыху пра перспектывы.**

— Усяго адзін прыклад. МАЗ збіраецца закупіць шасі, на базе якога можна арганізаваць, у тым ліку з нашым удзелам, адразу некалькі відаў патрэбных у народнай гаспадарцы машын. Якім чынам? Мяняючы функцыянальныя надбудовы пад вырашэнне тых ці іншых задач.

Так што мы думаем пра будучае, на месцы таптацца не збіраемся. І ўсё ж найбольш яркую перспектыву звязваем для сябе, як і кіруючая кампанія, са стварэннем мадэляў электробуса. Работа ў гэтым напрамку вядзецца.

Калі мы кажам пра перспектыву, то кожны раз патрабуецца вялікая работа канструктарскіх падраздзяленняў МАЗа па адаптацыі, прывязцы да мадэлі айчынных вузлоў і асобных дэталяў, нават невялікіх. Што датычыцца нашай адпаведнай службы, то яна занята цалкам мадэрнізацыяй базавых мадэляў. Тым больш што могуць быць разнастайныя пажаданні ад заказчыка. І кожны раз выконваецца разлік, як і дзе мацаваць, пад якія нагрузкі разлічваць, якія матэрыялы выкарыстаць, які будзе дызайн, і гэтак далей. Патрэбны час і прафесіяналізм. Мы для сябе зрабілі 3D-мадэль салона, што крышку спрашчае канструктарам работу з інтэр'ерам унутры кузава, але аб'ём дапрацовак пры любой мадыфікацыі істотны.

**— Як вы адчулі, што машына атрымалася канкурэнтаздольнай?**

— Просты паказчык: на складзе машын няма, іх разбіраюць. Я ўжо казаў, што чарговая партыя базавай мадэлі, камплектуючыя пад якую мы атрымалі, практычна ўся закантрактавана, распісана. А мадэрнізаваныя ў вялікіх аб'ёмах мы яшчэ не выпускаем. Зрабілі пакуль першую і атрымалі на яе ўсе неабходныя дакументы. Зараз паступіў заказ і робім яшчэ адну, яна ўжо на выхадзе. І дзве мадыфікаваныя машыны будзем рабіць як бы з апераджэннем тэрмінаў, вызначаных заказчыкам. Паралельна паставім на «стапелі» спецмашыну.

На ўсіх этапах вельмі дапамагае кіруючая кампанія. ААТ «Брэстмаш» у складзе «БЕЛАЎТАМАЗа» працуе з 2013 года. З таго часу галаўное прадпрыемства пачало паціху падгружаць сваімі кірункамі і наш завод, тым самым дазваляючы захоўваць яго жыццяздольнасць, не выкінуць людзей на вуліцу. Яно і сёння дапамагае ў фінансаванні асобных праектаў.

Генеральны дырэктар Валерый Валер'евіч Іванковіч падтрымаў перспектыву нашага завода як аўтазборачнага прадпрыемства. Дапамагаюць развівацца яго намеснікі, кіраўнікі падраздзяленняў, фактычна ўсе службы. Інакш нам было б з такой аб'ёмнай задачай не справіцца. Галаўное прадпрыемства дае нам таварныя крэдыты — у прыватнасці, металам. Усе глабальныя планы, звязаныя з мадэрнізацыяй ці рэканструкцыяй вытворчасці, увязваюцца з МАЗам.

Мы захоўваем на патоку прадукцыю, якую выпускалі да гэтага часу: насосы і іншую, але паступова асноўная ўдзельная вага перацячэ на буйнавузлавую зборку базавай мадэлі мазаўскага мікрааўтобуса і на выпуск яго мадыфікаваных мадэляў. Нашы машыны будзем выпускаць пад брэндам «МАЗ — Брэстмаш».

Генеральны дырэктар падчас наведвання паставіў задачу зрабіць тут сэрвісны цэнтр па абслугоўванні малатанажнай тэхнікі, а яшчэ шоўрум — выставачны салон-магазін прадукцыі холдынга. А таксама ўчасткі па зварцы і афарбоўванні кабін і кузаваў. Усё гэта павялічвае нашы шанцы на рынках. У выніку з'явіцца магчымасць таго, што прадпрыемства, згодна з патрабаваннямі Мытнага саюза, будзе ўключана ў пералік аўтавытворцаў.

Свой магчымы рынак вывучаем. Звяртаюцца да нас малыя прадпрыемствы, якім для работы патрэбна такая зручная машына, і шмат прыватных асоб: індывідуальныя прадпрымальнікі і фізічныя асобы таксама цікавяцца фактычна адаптаванай пад спецыфіку іх інтарэсаў аўтатэхнікай. Так што справа павінна пайсці. Мы не збіраемся хавацца толькі за чужую славу, а імкнёмся заваёўваць і ўласную.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 200274559.


За пультам апрацоўчага цэнтра ветэран вытворчасці Мікалай СЯНКЕВІЧ.


Адказны этап рэгуліроўкі (кіроўца-выпрабавальнік Сяргей САВІЦКІ).

Запіскі паломніцы

# ТАЙНЫ ЖЫВАТВОРЧАГА КРЫЖА

## Якое пакаранне атрымаў Лот, каму прысвяціў сваю фрэску вялікі грузінскі паэт Шата Руставелі і чаму царыца Тамара загадала пахаваць сябе адразу ў некалькіх месцах

**У апошнюю нядзелю верасня праваслаўныя адзначаюць асаблівае свята — Узвіжанне Крыжа Гасподняга. У народзе яго называюць яшчэ днём сустрэчы восені з зімой. Але ў яго паходжання больш сімвалічная глыбокая гісторыя. Летась менавіта ў гэтыя восеньскія дні мне пашчасціла трапіць у Іерусалім і акунуцца ў яе, як той сказаў, з усёй галавой. І яшчэ пераканацца, што нічога ў свеце не адбываецца проста так.**

### НАВОШТА 33 ГАДЫ ЛОТ ПАЛІВАЎ СУХОЕ ДРЭВА

Памятаеце рублёўскую «Тройцу»? Усё пачалося з таго, што аднойчы роданачальніку выбранага народа Аўрааму быў знак. *«І з'явіўся яму Гасподзь каля дубровы Мамрэ, калі ён сядзеў каля ўваходу ў шацёр свой, у час дзённай спёкі. Ён узвёў вочы свае і зірнуў, і вось, тры мужы стаяць насупраць яго...»* Гэтыя радкі са старазаветнага Быцця ў XV стагоддзі праілюстраваў іканапісец Андрэй Рублёў. Ну хто не ведае гэты замілавальны сюжэт, дзе пад Мамврыйскім дубам сядзяць і трапезнічаюць тры анёлы. Паводле падання, перад тым як адправіцца на загад Бога ў пакараныя ім Садом і Гамору, анёлы пакінулі Аўрааму свае тры посахі. Ён іх потым перадаў пляменніку Лоту, які саграшыў са сваімі дочкамі. Каб Бог дараваў яму гэты грэх, Лот павінен быў паліваць посахі да тых часоў, пакуль сухое дрэва не пусціць карані. Цуд адбыўся праз 33 гады. Увесь гэты час Лот насіў ваду з Іардана, а сатана спакушаў яго — або выпіваў, або разліваў ваду. Лот цяжка ўздыхаў і зноў браўся за сваю, здаецца, бессэнсоўную справу. Але аднойчы посахі прараслі, прычым адначасова кедрам, кіпарысам і пеўгам (хвояй) у адным дрэве. І ў гэты момант Лот зразумеў, што памілаваны.

У кнігах Старога Запавету ёсць таксама прароцтва, што Хрыстос будзе распяты на трохсастаўным дрэве. «Слава Лівана прыйдзе да цябе, кіпарыс, ядловец і кедр злучацца, каб упрыгожыць месца свяцілішча Майго, і Я праслаўлю падножжа ног Маіх...» — прадказвае прарок Ісая. Дрэва, узгадаванае Лотам, вырасла такое нязвычнае і прыгожае, што нават цар Саламон хацеў выкарыстаць яго для будаўніцтва храма. Яго спілавалі, але зрабіць з яго нічога не змаглі: яно ўвесь час змянялася ў памерах — то скарачалася, то павялічвалася. Ёсць паданне, што няўдалую бэльку пакінулі ў якасці лаўкі. На яе аднойчы села царыца Саўская, якая прыехала ў госці да Саламона. І падскочыла, быццам бы яе агнём апаленая. А потым пакланілася дрэву і сказала, што на ім будзе раскрыжаваны Збавіцель свету, а царству іўдзеяў прыйдзе канец. Саламон спужаўся і загадаў закапаць бэльку. Потым на гэтым месцы была пабудавана купальня для абмывання ахвярных жывёл. Гэтае месца стала называцца Авечай купеллю і праславілася вылячэннямі. Незадоўга да пакарання Хрыста бервяно нечаканым чынам усплыло...



На фрэсцы Шата Руставелі зрабіў сябе зусім маленькай казяўкай на фоне вялікіх хрысціянскіх багасловаў.



Храмавыя сцэны ўпрыгожваюць грузінскія і грэчаскія роспісы XII—XIII стагоддзяў.

### ПАХОДЖАННІ БІБЛЕЙСКАГА КРЫЖА

Наш паломніцкі аўтобус выязджае з Бейт-Джалы, дзе мы наведалі храм Свяціцеля Мікалая. У храме знаходзіцца вельмі шанаваны ў Віфлееме абраз святога Георгія. Яго імя праз стрыечную сястру Ніну, хрысціянскую асветніцу Грузіі, таксама звязана з манастыром Жыватворчага Крыжа, куды мы накіроўваемся. Па дарозе наша гід Аляксандра нагадвае гісторыю пра Лота і ўдакладняе, што ўчора, калі мы акуналіся ў свяшчэнныя воды ракі Іардан, мы якраз былі непадалёк ад таго біблейскага дуба, пад якім сустракаўся Аўраам з анёламі. Мы ж едзем у тое месца, дзе Лот па загадзе Божым утыркнуў посахі ў зямлю і вырасціў цудоўнае дрэва, якое стала асновай для Жыватворчага Крыжа. На гэтым месцы ў IV стагоддзі роўнаапостальнай царыцай Аленай быў пабудаваны храм, які потым падчас нашэсця разбурылі. Царыца Алена стала менавіта той абраніцай Божай, у якой атрымалася знайсці цудадзейны крыж праз некалькі стагоддзяў, як на ім раскрыжавалі Хрыста. Ён знаходзіўся якраз пад язычніцкім храмам Венеры, які рымскі імператар Андрыян загадаў пабудаваць, каб сцерці ў народа памяць пра Хрыста. Але гэтым толькі абазначыў святое месца. Калі храм знеслі, пад ім знайшлі тры крыжы. Кожны з іх прыкладвалі да нядаўна памерлага чалавека. Ад дотыку Святога Крыжа памерлы ўваскрэс. Святыня знаходзілася ў спецыяльна пабудаваным царыцай Аленай і яе сынам імператарам Канстанцінам храме Уваскрэсення Гасподняга. У 614 годзе ў Святую зямлю прыйшлі персы, якія не толькі разбуралі манастыры і забівалі манахаў, але і забралі з храма ў якасці ваеннага трафея крыж Хрыста. І толькі праз 14 гадоў візантыйскі імператар Іраклій пры дапамозе іншых цароў, сярод якіх вялікую дапамогу аказаў грузінскі цар, сабраў вялікае войска і рушыў супраць персаў. Бітва завяршылася перамогай аб'яднаных візантыйскіх войскаў, і крыж вярнулі. Гэтыя дзве падзеі, звязаныя са здабываннем Крыжа і вяртаннем яго, згадваюцца ў гэтыя святочныя дні. А ў памяць аб той вызначальнай бітве ўчастак, дзе вырасла дрэва, быў перададзены ў дар грузінскім царам. Уся далейшая гісторыя манастыра Жыватворчага Крыжа звязана з пастаяннымі войнамі. Яго ўвесь час умацоўвалі, і ён паступова ператварыўся ў непрыступную крэпасць. Гэта, дарэчы, выратавала яго ад разбурэння ў эпоху Аль-Хакіма ў 1009 годзе.

### ПРА ШТО МАРЫЎ У СЦЕНАХ МАНАСТЫРА ШАТА РУСТАВЕЛІ?

З VII стагоддзя грузінская маёмасць паступова пашыраецца. Пэўны час тут жыла грузінская царыца Тамара — прыгожая і мужная ваяўніца. Аднойчы ў яе закахаўся міністр фінансаў — цудоўны паэт Шата з сяла Руставі. Калі чарговы раз у Іерусалім з Грузіі збіраўся караван, каб падтрымаць манастыр, Шата папрасіўся, каб яго адправілі ў якасці кіраўніка паходу. Знамянальна, што манастыр сёння знаходзіцца на вуліцы Шата Руставелі. Тут ён дапісаў свайго «Віцязя ў тыгравай шкуры», дзе намаляваў вобраз горача каханай царыцы Тамары. Лічыцца, што паэт тут і пахаваны. Па адной з версій, тут жа знаходзіцца пахаванне і яго любай. Але дакладна на гэтае пытанне ніхто не адкажа. Аднойчы да царыцы Тамары пасватаўся персідскі шах, але яна яму адмовіла. І ён паабяцаў, што яна будзе ягонай пасля сваёй смерці. Царыцу насцярожылі гэтыя словы. Калі яна памерла, з яе апартаментаў адправіліся ў розныя канцы свету некалькі караванаў з трунамі. Лічыцца, што адна з іх, прычым тая, дзе ляжыць царыца, знаходзіцца тут.

На адной з калон храма ёсць выява Шата Руставелі, а ўнізе на старагрузінскай мове напісана: «Я Шата з Руставі аднаўляў гэты храм, рабіў роспісы і прысвячаю гэта Усявышняму». Сябе ён абазначыў маленькай фігуркай, якая схіляецца перад двума святымі — Максімам Спавядальнікам і Іаанам Дамаскінам.

У XVII стагоддзі ў храме акрамя грузінскіх манахаў неслі паслушэнства яшчэ і грэчаскія. Таму тут часткова захаваўся і грэчаскі роспіс.

— У 2005 годзе, калі ў манастыры ішла рэстаўрацыя і рабіліся раскопкі, былі знойдзены два пахаванні — мужчыны і жанчыны, — інтрыгуе Аляксандра. — І гэта пры тым, што манастыр за ўсю сваю гісторыю быў выключна мужчынскі. Ёсць меркаванне, што жаночае пахаванне належыць менавіта царыцы Тамары.

З манастыром звязана імя яшчэ адной святой — Ніны, стрыечнай сястры Георгія Пераможца. Ёй быў знак ад Багародзіцы, што яна павінна несці Божае слова на Каўказ, і яна адправілася туды. Хутка яна стала асветніцай зямлі грузінскай. З яе пачынаецца не толькі хрышчэнне Грузіі, але і наладжваецца моцная сувязь гэтай краіны са Святой зямлёй.

### ПАКАРАННЕ ДЛЯ СІМЯОНА БОГАПРЫІМЦА

Непадалёк ад манастыра Жыватворчага Крыжа ёсць яшчэ адна праваслаўная славутасць — царква, прысвечаная Сімяону Богапрыімцу. У канцы XIX стагоддзя Іерусалімскі праваслаўны патрыярхат набыў гэты ўчастак, каб захаваць месца, дзе жыў гэты святы і быў пахаваны. Адсюль ён штодзённа хадзіў да іерусалімскага храма, што на гары Сіён, каб сустрэць сына Божага. У чаканні Збавіцеля ён пражыў больш чым 350 гадоў.

— У III стагоддзі егіпецкі цар Пталамей пажадаў перакласці старазапаветныя тэксты на грэчаскую мову для Александрыйскай бібліятэкі, — расказвае гісторыю яго даўгалецця Аляксандра. — Адсюль у Александрыю былі запрошаны 70 мудрацоў, сярод якіх і Сімяон. Ён перакладаў Прароцтва Прарока Ісаіі, дзе ішла размова пра тое, што прыйдзе час і Дзева зачне ў чэраве. На іўрыце слова «дзева» мае некалькі значэнняў. Гэта і зусім юная непарочная дзяўчына, і маладая жанчына, і сузор'е. Сімяон пераклаў як «маладая жанчына», пасля чаго яму з'явіўся Архангел Гаўрыіл і сказаў, што ён памыляецца, трэба пісаць непарочная. Сімяон усумніўся і пакінуў, як ужо напісаў. За гэта ён быў пакараны даўгалеццем і павінен быў хадзіць на прыступкі храма. Менавіта ён першы прыме на рукі нованароджанага Збавіцеля і абвесціць, што той прыйшоў на зямлю. Пасля таго, як выканаў сваю місію, ён памёр і быў пахаваны каля свайго дома.



Людзі ідуць пакланіцца месцу, дзе вырасла дрэва Жыватворчага Крыжа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

## Извещение о проведении 9 октября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже жилого помещения (квартиры), принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «Квартира 21» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-21 (1-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,7 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805743) | 146 400,00 | 5 000,00 |

**Шаг аукциона:** 5 000,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условия торгов:**

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

2. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического или физического лица (для физического лица – документ, удостоверяющий личность; для представителя физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя и нотариально заверенную доверенность; для представителя юридического лица – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица), а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия 09.10.2020 в аукционных торгах по продаже жилого помещения). Участнику, не ставшему победителем торгов (покупателем), внесенный задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом имущества и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **9 октября 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.09.2020 по 07.10.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра жилого помещения обращаться по телефонам: (017) 395-48-60, (044) 777-11-58.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 395-48-60, (044) 777-11-58 (ОАО «Минский домостроительный комбинат»).

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – **www.mgcn.by.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ХОЛОДИЛЬНИКА РАСПРЕДЕЛИТЕЛЬНОГО

**(составные части и принадлежности: машинное отделение, бытовое помещение) с инв. № 644/С-2071 общей площадью 1 487,1 кв. м**

## И ЩИТА УЧЕТА ЭЛЕКТРОЭНЕРГИИ С ДВУМЯ СЧЕТЧИКАМИ (инв. № тб-101),

**расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002781 площадью 0,4471 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1, участок № 4 (далее – Объекты)**

**Часть капитального строения обременена договорами аренды (сведения можно получить у организатора аукциона).**

Начальная цена с НДС (20 %) – **156 891,60** бел. руб. *Начальная цена снижена на 10 %*. Задаток 10 % от начальной цены – **15 689,16** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата Объектов производится в следующем порядке:

- 30 (тридцати) процентов стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 70 (семидесяти) процентов в течение 6 (шести) календарных месяцев с внесением платежей равными долями (по 11,6 %), с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, если иное не установлено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объектов). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 14.07.2020.

Аукцион состоится **13.10.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.** УНН 600122715

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1: здание административно-хозяйственного** *(составные части и принадлежности: цокольный этаж, крыльцо)* **с инв. № 610/С-57979 общей площадью 439 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620887403601000302 (право аренды по 02.02.2113) площадью 0,4633 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Житьково, ул. Новая, 15А.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередач напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0213 га; охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0249 га; водоохранная зона водных объектов, пл. 0,4186 га; прибрежная полоса водных объектов, пл. 0,0447 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **52 118,93 бел. руб.** *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **5 211,00** бел. руб.

**Лот № 2: комплекс зданий и сооружений «Тепличный комбинат», расположенных на земельном участке с кадастровым номером 620887408101000475 (право аренды по 29.03.2035) площадью 13,4555 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Пчельник, ул. Советская, 1И,** в составе:

- **тепличный комбинат** *(составные части и принадлежности: административное здание, бойлерная, теплицы)* **с инв. № 610/С-61921 общей площадью 23 914 кв. м;**
- **административное здание (проходная)** *(составные части и принадлежности: площадки и проезды, два ограждения)* **с инв. № 610/С-61932 общей площадью 127,9 кв. м;**
- **весовая с инв. № 610/С-61928 общей площадью 64,7 кв. м;**
- **пункт техобслуживания техники с инв. № 610/С-61930 общей площадью 122,3 кв. м;**
- **стекольная с навесом для хранения минеральных удобрений** *(составные части и принадлежности: пристройка)* **с инв. № 610/С-61926 общей площадью 244,2 кв. м;**
- **склад удобрений, ядохимикатов с инв. № 610/С-61931 общей площадью 348,6 кв. м;**
- **сети водопровода с инв. № 610/С-61924 протяженностью подземной прокладки 1614 м;**
- **сети канализации с инв. № 610/С-61923 протяженностью подземной прокладки 401,93 м;**
- **водонапорная башня с инв. № 610/С-61922 общей площадью 9 кв. м.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона электрических сетей, пл. 0,5185 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, пл. 0,3080 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **389 287,96 бел. руб.** *Цена снижена на 40 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **38 928,80** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

